незалежная газета

№ 35 (633) 16 верасня 2009

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыдня, у серады



**10 гадоў, як знік Ганчар**

Старонка 2

**Дубавец: Лукашэнка ўвасабляе краіну і народ**

Старонка 7

**Патрык Суэйзі: праца важнейшая за боль**

Старонка 11



## У НУМАРЫ

**«Чым такую бульбу капаць, хай гніе!»**

Цэны на бульбу могуць быць рэкорднымі. **Старонка 4.**

**Улады рэабілітавалі Аршанскую бітву**

З 495-й гадавінай Аршанскай бітвы адбылося тое самае, што і паўтара года таму з 90-годдзем Беларускай Народнай Рэспублікі. **Старонка 5.**

**«Немец» на чале Саюза палякаў**

Улады ўспомнілі пра Станіслава Сямашку пасля серыі скандалаў, звязаных з парадкаваннем нямецкіх могілак. **Старонка 8.**

**Юра Дзямідовіч сыграе ў беларускім фільме жахаў**

Яго здымае аўтар «Акупацыі» Андрэй Кудзіненка. **Старонка 9.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Бацька ў Вільні

16 верасня Вільню наведае Аляксандр Лукашэнка. Ён прыедзе на беларуска–літоўскі эканамічны форум. Чакаецца спатканне з прэзідэнтам Літвы Даляй Грыбаўскайтэ **(на фота)**.



Апошні раз Літву Лукашэнка наведваў у 1998 годзе. Тады ў Medніках ён сустракаўся з тагачасным кіраўніком Літвы Валдасам Адамкусам. Гэты ж візіт адбываецца пасля адмены візавых санкцый Еўрасаюза.

«З Беларуссю, нягледзячы на яе недэмакратычны лад, у нас больш супольнага, чым адрозненняў», — заявіў перад візітам Аляксандра Лукашэнкі міністр замежных справаў Літвы Вігаўдас Ушацкас. Па яго словах, «літоўцы павінны размаўляць і з тымі, хто ва ўладзе, і з тымі, хто ў апазіцыі, паколькі наш сусед такі, які ёсць».

«Мы зацікаўленыя ў тым, каб Беларусь была не толькі незалежнай і эканамічна стабільнай, але і каб яна была краінай, якая стварае грамадзянскую супольнасць. Беларусь нам важная і як рынак з 10 млн спажыўцоў. Мы бачым зацікаўленасць літоўцаў у інвеставанні ў Беларусь», — кажа В.Ушацкас.

**Працяг на старонцы 3.**

## «Візіт важны з псіхалагічнага аспекту»

Так мяркуе палітолаг **Дзяніс Мельянцоў**.

**«Наша Ніва»: Наколькі для Лукашэнкі важны гэты візіт?**

**Дзяніс Мельянцоў:** Ён важны акурат з персанальнага псіхалагічнага аспекту для Лукашэнкі, а не для Беларусі. Беларускі лідэр цяпер імкнецца наведаць як мага большую колькасць еўрапейскіх сталіц, каб паказаць Крамлю, што яго прымаюць не толькі ў Маскве. З другога боку, таксама прысутнічае эканамічны фактар. Вельмі важнае пытанне пераваліі беларускіх тавараў праз Клайпедскі порт. Зрэшты, гэта маглі абмеркаваць і прэм'ер-міністры.

**Працяг на старонцы 3.**

www.svaboda.org

твая свабода

| | | |
|---|---|---|
| 06.00-08.00 | 6105 кГц | 49 м |
| | 6120 кГц | 49 м |
| 18.00-20.00 | 7445 кГц | 41 м |
| | 9725 кГц | 31 м |
| 20.00-22.00 | 6050 кГц | 49 м |
| | 6105 кГц | 49 м |
| 22.00-24.00 | 5820 кГц | 49 м |
| | 9405 кГц | 31 м |

612 кГц 490 м сярэдня хвалі

больш чым радыё

# Аляксандр Мілінкевіч: Калі будзе нацыянальная кааліцыя, я гатовы ісці на выбары

Лідэр Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч працягвае праходзіць курс рэабілітацыі пасля аперацыі ў родных Берштах. Тым не менш, у мінулую суботу ён наведаў з'езд Партыі БНФ.

**«Наша Ніва»: Аляксандр Уладзіміравіч, як здароўе?**

**Аляксандр Мілінкевіч:** Нармальна. На з'ездзе БНФ маглі бачыць, што яшчэ не бегаю, але ўжо хаджу.

**«НН»: Якія ўвогуле ўражанні пакінуў з'езд?**

**АМ:** Розныя. І добрыя, і кепскія. Ацэнку новаму кіраўніцтву дасць толькі час. Але на маё пераканане, у кожнай палітычнай сіле павінны змяняцца лідэры, твары.

Прыемна, што з'езд праходзіў у жорсткай і бескампраміснай барацьбе, але ў межах дэмакратычных працэдур. Далёка не кожная палітычная сіла сёння здольная на гэта. БНФ засведчыў, што ён жывы.

Зычу новаму кіраўніцтву большага аўтарытэту ўнутры грамадства. З негатыўнага — не спадабалася, што мала гаварылі пра будучыню Беларусі, пра стратэгію развіцця, пра геапалітычны аспект. Было шмат персанальнай барацьбы, але мала дыскусій па асноўных пытаннях.

**«НН»: Пасля перамогі Януковіча можна гаварыць пра стварэнне правай нацыянальнай кааліцыі?**

**АМ:** Пра гэта размова ідзе вельмі даўно. З такой ініцыятывай я выступаў яшчэ на Кангрэсе дэмсіл у 2007 годзе. Нацыянальная праеўрапейская кааліцыя мусіць паўстаць. У АДС уваходзяць вельмі розныя сілы. Мяне вось здзівіла, што кандыдат ад АДС на праймерыз павінен адказаць на пытанне: «Чаму не мусіць быць Лукашэнка?» Для мяне больш важнае пытанне: «Чаму мусім быць мы?» Некаторыя апазіцыянеры часта кажуць, што вось мы скінем Лукашэнку, а пасля разбярэмся. Не — мы павінны даць ясную мадэль рэформаў, якую правядзём у выпадку перамогі.

**«НН»: Можа, за лета вызначыліся, ці будзеце ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах?**

**АМ:** Я гатовы ўдзельнічаць. Але для гэтага павінна быць утвораная нацыянальная кааліцыя. Патрэбная сіла, здольная да барацьбы. Важна таксама ведаць, па якіх правілах будзе адбывацца гульня, ці будуць змены ў выбарчым заканадаўстве. Я камандны чалавек, буду слухаць, што кажуць людзі. Толькі потым вызначуся са сваім удзелам у выбарах.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

# Дзесяць гадоў таму зніклі Ганчар і Красоўскі

16 верасня 1999 года пры нявысветленых абставінах бясследна зніклі палітык Віктар Ганчар і яго сябра, прадпрымальнік Анатоль Красоўскі. Пазней на меркаваным месцы здарэння — вуліцы Фабрычнай — былі знойдзеныя аскепкі шкла і сляды крыві. Паводле сведчання колішняга начальніка мінскага СІЗА №1 Алега Алкаева, Ганчар і Красоўскі былі выкрадзеныя і расстраляныя паводле загаду асоб, набліжаных да Аляксандра Лукашэнкі. Усе спробы расследавання факту знікнення Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага сутыкаліся з перашкодамі ўладаў.

**АП**

## КАМЕНТАР

### Зімоўскі прагназуе перыяд жастачайшай эканоміі

У сваім блогу на naviny.by кіраўнік лукашэнкаўскага тэлебачання ўскосна прызнае, што «неабвешчаная выбарчая кампанія» ўжо распачалася. Для яе «туземныя і заезджыя паліттэхнолагі прапануюць Кіраўніку [у тэксце з вялікай літары — Рэд.] дзяржавы раскласці пасьянс, адзін з варыянтаў якога называецца «Непапулярны ўрад».

Зімоўскі прагназуе нарастанне фінансавых цяжкасцяў: «Інсайдэры бюджэтнага працэсу ведаюць, што перыяд жастачайшай эканоміі і зацягвання пасаў яшчэ наперадзе. Грамадзяне, што выхоўваюцца ў духу сацыяльнага аптымізму, ні апчаджаць, ні зацягваць пасы не звыклі. А прыйдзецца».

З заўважным цынізмам Зімоўскі канстатуе, што «ўраду след падбаць пра анестэтыкі і галюцынагенныя рэчывы ў выглядзе свабоды гандлю і адмовы ад барацьбы з п'янствам».

Варыянты развіцця сітуацыі ардынарныя: «А.Р.Лукашэнка можа, вядома, выгнаць лаяльнага тэхнакрата С.С.Сідорскага і юрыдычна замацаваць за сабой прэм'ерскія паўнамоцтвы pro tempore. Яшчэ спатрэбіцца самааддадзены рыначнік а la Я.Ч.Раманчук у рангу віцэ-прэм'ера, якога прызначаць паводле прынцыпу «хлопец-цвік, сам у сценку лезе». І застанецца выканаць усе умовы нашых новых сяброў з МВФ».

Агульны тон допісу, аднак, стварае ўражанне, што Лукашэнка паслухае такіх паліттэхнолагаў і зробіць наадварот.

**Мікола Бугай**

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Алег Латышонак едзе з Мінска ў Брэст са сваёй кнігай «Нацыянальнасць — беларус»

**27 верасня (нядзеля) у Салігорску у 14.00** плануецца прэзентацыя новай кнігі Алега Латышонка «Нацыянальнасць — беларус». **У той жа дзень у 19.00** сустрэча са знакамітым беластоцкім гісторыкам адбудзецца **ў Баранавічах (вул. Міцкевіча, 65)**. **28 верасня** запланаваная сустрэча з Алегам Латышонкам **ў Белаазёрску і Бярозе**. Скончыцца праграма прэзентацый **29 верасня ў аўторак** сустрэчай з чытачамі **ў Брэсце ў 19.00 (вул. Маладагвардзейская, 14/1)**. Усе прэзентацыі адбудуцца ў рамках кампаніі «Будзьма».

Даведкі праз т.: (029) 550–79–69.

## Севярынцу вярнулі канфіскаваны раман

Гэты твор з працоўнай назвай «Сэрца святла» палітык Павал Севярынец пачаў пісаць яшчэ на высылцы ў Малым Сітне. 6 верасня сустаршыня Беларускай хрысціянскай дэмакратыі аддаў рукапіс свайго твора сябру БХД Дзянісу Садоўскаму, каб той зрабіў ксеракопію. Садоўскі перадаў больш за 700 аркушаў рамана свайму сябру. І якраз у той час на здымнай кватэры апошняга адбыўсяператрус. Супрацоўнікі міліцыі Цэнтральнага раёна сталіцы і кадэбісты забралі і Севярынцаў рукапіс. «Цяпер супрацоўнікі спецслужбаў будуць яго першымі чытачамі», — іранізаваў шакаваны аўтар.

Севярынец накіраваў скаргі ў РУУС і пракуратуру Цэнтральнага раёна з патрабаваннем вярнуць раман. Праз тыдзень раман вярнулі праз гаспадыню кватэры, дзе адбываўся ператрус. Толькі ў кнізе цяпер не стае 216 старонак — дзвюх частак з дванаццаці. Чаму супрацоўнікі паваахоўных органаў не аддалі гэтыя часткі, застаецца загадкай. Палітык збіраецца далей змагацца за поўнае вяртанне свайго твора.

**ЗП, ВЖ**

## Сяргей Атрошчанка прыпыняе выхад газеты «Обозреватель»

У інтэрв'ю «Ежедневнику» заснавальнік газеты Сяргей Атрошчанка заявіў: «Гэта не звязана ні з палітыкай, ні з эканамічнай сітуацыяй. Мне спатрэбіўся адпачынак для пераасэнсавання зробленага ў журналістыцы».

«Обозреватель» выдаецца сем гадоў і дасягнуў накладу ў 33 тысячы асобнікаў. Сяргей Атрошчанка з'яўляецца заснавальнікам і генеральным дырэктарам кампаніі па вытворчасці бялізны SERGE. Ад 1994 да 2002 года быў выдаўцом «Свободных новостей».

Паводле некаторых звестак, «Обозреватель» стварыўся прадпрымальнікам пры спрыянні пэўных дзяржаўных структур у якасці «прыватнай», але спрыяльнай для лукашэнкаўцаў газеты. Ёнактыўна распаўсюджваўся праз «Саюздрук», яго не зачапілі абмежаванні. Яго нават бясплатна раздавалі ў цягніках Беларускай чыгункі, нароўні з «Советской Белоруссией».

**ЯМ**

### Курсы мовы і гісторыі

Бясплатныя курсы беларускай мовы і гісторыі з выкладчыкамі Беларускага ліцэя для вучняў 10–х класаў **кожны аўторак з 18.00 да 19.30 у сядзібе Таварыства беларускай мовы (вул. Румянцава, 13, ст. метро «Плошча Перамогі»)**.

## СЦІСЛА

### «Беларуськалій»: быў першы, стаў саракавы

Міністэрства па падатках і зборах склала спіс найбуйнейшых падаткаплатнікаў Беларусі па выніках першага паўгоддзя. На першых месцах — «Белтрансгаз», «Мазырскі НПЗ» і «Нафтан». Самае значнае падзенне ў «Беларуськалія» — з першага месца на саракавое.

### Студэнцкая вёска за $250 млн

Будаўніцтва студэнцкай вёскі пачалося летась. Першы корпус фінансаваўся з рэспубліканскага бюджэту. За астатнія будынкі прыйдзецца заплаціць абласцям. Агулам праект ацэньваецца ў $250 млн. Восем карпусоў павінны скончыць у 2011 г. Тады ж побач запрацуе станцыя метро.

### Схаваўся ў салому, каб пакурыць

10 верасня каля вёскі Карацк загарэліся тры сцірты сельгаспрадпрыемства «Налібакі-Нёман». Агонь знішчыў 400 тон саломы. Міліцыя лічыць, што сцірты ўпаліў васьмігадовы вучань 3-га класа мясцовай школы, які схаваўся ў салому, каб пакурыць.

### Восеньскі фестываль эротыкі

16 верасня ў клубе «Roxy» адбудзецца Мінскі восеньскі фестываль эротыкі «Медсёстры па выкліку». Цвіком праграмы будзе выступ танцораў стрыптызу. На фестывалі дазволеныя фота- і відэаздымкі.

**ЯМ, ВЖ, паводле ej.by, afisha.tut.by**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazu дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй за ахвяраванні

Мікалаю К., Алесю П., Аляксандру Р. з Полацкага раёна.
Наталлі У. з Пухавіцкага раёна.
А.Б. з Ваўкавыскага раёна.
Паўлу Д., В.Б. са Светлагорскага раёна.
Леакадзіі Н., Ганне Р. з Валожынскага раёна.
Наталлі Т., Мікалаю М. з Салігорска.
Ірыне Ц. з Жыткавіцкага раёна.
Вользе П. з Бабруйскага раёна.
Аляксандру Г. з Кіраўскага раёна.
С.Р., Т.Ш. з Бярозаўскага раёна.
М.Б. з Дубровенскага раёна.
Юрыю Г. з Гродна.
Н.К. з Дубровенскага раёна.
Сяргею Ц. з Докшыцкага раёна.
Мікалаю П. з Віцебску.
Міхаілу К. з Рэчыцкага раёна.
Г.Б. з Ліды.
М.Ш. з Клімавіцкага раёна.

# Бацька ў Вільні

Працяг са старонкі 1.

У МЗС Літвы пацвярджаюць, што Грыбаўскайтэ гатовая сустрэцца з Лукашэнкам. Як сказаў Ушацкас, Літва хоча «зацікавіць кіраўнікоў Беларусі заходняй сістэмай».

У сваю чаргу, былога спікера Сойма Арунаса Валінскаса дзівіць, што Літва стала першай краінай Еўрасаюза, куды прыедзе Лукашэнка, а таксама тое, што яго будуць прымаць на найвышэйшым узроўні.

Напярэдадні Вільню наведалі прадстаўнікі апазіцыі. Лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, сустаршыня Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Павел Севярынец, а таксама экскандыдат на пасаду прэзідэнта Аляксандр Казулін сустрэліся з прэм'ер-міністрам Літвы Андрусам Кубіліюсам.

«Мы павінны супрацоўнічаць з Літвой, з нашымі суседзямі. Ад гэтага супрацоўніцтва карысць будзе і вам, і нам. Чакаю добрай, харошай сустрэчы з Грыбаўскайтэ. У нас ёсць пра што пагаварыць», — заявіў напярэдадні паездкі А.Лукашэнка ў інтэрв'ю літоўскім СМІ.

У Вільню Лукашэнка прыедзе разам з малодшым сынам Мікалаем. Плануецца, што яны наведаюць адзін з літоўскіх паркаў водных атракцыёнаў.

**Зміцер Панкавец**

**Даля Грыбаўскайтэ**

Нарадзілася 1 сакавіка 1956 у Вільні. Скончыла Ленінградскі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «палітэканомія» (1983). Да развалу Савецкага Саюза выкладала ў Вышэйшай партыйнай школе. Была камісарам (міністрам) Еўрасаюза па бюджэце і фінансавым планаванні. У 2009 Даля Грыбаўскайтэ выйграла прэзідэнцкія выбары ў першым туры з вынікам 69%. Не замужам.



«...успомню Вострую Браму святую і ваякаў на грозных канях...»?

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Лаўрынас Кашчунас: У Еўрасаюза няма рычагоў уплыву на Лукашэнку

Дырэктар літоўскага Цэнтра геапалітычных даследаванняў Усходу **Лаўрынас Кашчунас** адказвае на пытанні «Нашай Нівы».

**«Наша Ніва»: Чаго палітычныя эліты Літвы чакаюць ад візіту Лукашэнкі?**

**Лаўрынас Кашчунас:** Найважнейшы тут геапалітычны аспект. Літва з'яўляецца своеасаблівым акном Беларусі ў Еўропу. Упэўнены, што візіт робіцца са згоды Еўрапейскага Саюза. Адбываецца такое вось уцягванне беларускіх уладаў у нейкую гульню. Але тут акурат-такі і ўзнікае пытанне: па чыіх правілах будзе праходзіць гульня? Нічога кепскага ў візіце і не было б, каб мы мелі канкрэтную стратэгію, што мы будзем рабіць потым. Я не адчуваю нейкага стратэгічнага падыходу з боку Еўропы. Усе размовы зводзяцца толькі да таго, што трэба сябраваць. Другі аспект — гэта інтарэсы бізнэсу. Порт Клайпеды, транзіт беларускіх прадуктаў, інвестыцыі. Усе разумеюць, што Лукашэнка — гэта адзіная фігура, якая нешта вырашае ў Беларусі, і трэба наладжваць з ім кантакты. Разам з тым, сёння бізнэс прыйдзе, а заўтра яго закрыюць. Лукашэнка ж не пойдзе на рэформы, бо кожная ліберальная рэформа — гэта дэмантаж ягонага рэжыму.

**«НН»: А ці магчыма Еўрасаюзу навязаць свае правілы гульні Лукашэнку?**

**ЛК:** Справа ў тым, што не маем абсалютна ніякіх рычагоў, каб гульня пайшла па правілах ЕС. Тыя ж крэдыты МВФ не ёсць паўнавартасным рычагом. Думаю, што сапраўдныя рычагі ёсць толькі ў Расіі — гэта рыначныя цэны на газ.

**«НН»: Чаму менавіта ў Літву праходзіць першы візіт Лукашэнкі ў краіны Еўрасаюза?**

**ЛК:** Мы нават у Вільні не ведаем, хто ж запрасіў кіраўніка Беларусі. Ніхто не хоча ў гэтым прызнацца. Літва — гэта ўсё ж бліжэйшы сусед Беларусі, а таксама эксперт вашай краіны ў ЕС. З палітычнага пункту гледжання візіт у тую ж Польшчу быў бы больш складаным для Лукашэнкі.

**«НН»: Пра што будуць гаварыць Лукашэнка і Грыбаўскайтэ?**

**ЛК:** У асноўным гутарка будзе па эканамічных пытаннях, бо крызіс, і трэба супрацоўнічаць. Можа, будзе нейкая зандацыя па энергетычных праектах, тая ж АЭС. Палітыка Літвы апошнім часам актыўна змяняецца, мы ідзём на большую эканамізацыю замежнай палітыкі.

**«НН»: А сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі ці закрануць?**

**ЛК:** Такія пытанні заўсёды прысутнічаюць. Думаю, яны будуць і на гэты раз. Але гэтая тэма не будзе галоўнай.

**«НН»: Ці ёсць у Літве незадаволеныя гэтым візітам?**

**ЛК:** Ёсць. Хаця абсалютная большасць выступае за візіт з пэўнымі агаворкамі. Усё ж у Літве пазіцыя адназначная: самае галоўнае — незалежная Беларусь. Тым не менш, правыя Літвы, прынамсі, моладзь, пратэстуюць супраць візіту Лукашэнкі.

**Гутарыў ЗП**

## Дзяніс Мельянцоў: Візіт важны з псіхалагічнага аспекту

Працяг са старонкі 1.

**«НН»: А чаму візіт адбываецца менавіта ў Літву?**

**ДМ:** Літва доўгі час з'яўляецца такім нефармальным адвакатам Беларусі ў Еўрасаюзе. Выступае пасярэднікам у перамовах паміж бакамі. Нават падчас ізаляцыі нашай краіны літоўцы неяк падтрымлівалі адносіны з Беларуссю. Візіты Сідорскага ў 2005 і 2006 гадах выклікалі незадаволенасць з боку Бруселя. Цяпер жа арганізаваць такую паездку нашмат прасцей. Тым больш, нядаўна Лукашэнка наведваў Рым.

**«НН»: Чаго можна чакаць ад сустрэчы Лукашэнкі і Грыбаўскайтэ?**

**ДМ:** Думаю, што гэта будзе дзяжурная сустрэча, і ніякага прарыву чакаць не даводзіцца. Асноўнай тэмай стане эканамічнае супрацоўніцтва.

**Гутарыў ЗП**

**Дзяніс Мельянцоў**

Нарадзіўся ў 1980 у Магілёве. Скончыў гістарычны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. У магістратуры Інстытута міжнародных адносінаў і палітычных навук пры Віленскім універсітэце (Літва) ў 2006 годзе абараніў магістарскую дысертацыю па міжнародных адносінах. Намеснік дырэктара Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў (BISS), які базуецца ў Вільні.

## Эгідыюс Варэйкіс: У мяне няма даверу да Лукашэнкі

Літоўскі парламентарый Эгідыюс Варэйкіс («Саюз Айчыны — хрысціянскія дэмакраты») насцярожана ставіцца да візіту ў Вільню Аляксандра Лукашэнкі. Менавіта кансерватары атрымалі перамогу на апошніх выбарах у Сойм.

«Я за найлепшыя адносіны з Беларуссю, у нас усё ж супольная гісторыя. Таксама важнае пытанне бяспекі. Я жыву ў вёсцы ў 30 кіламетрах ад мяжы Еўрапейскага Саюза, калі да мяжы было б 300 кіламетраў — гэта была б зусім іншая справа. Кожны літоўскі прадпрымальнік можа вам сказаць, што рынак Беларусі патрэбны. Але яны хочуць еўрапейскіх нормаў — без карупцыі, прэзідэнцкага фонду. У мяне няма даверу да Лукашэнкі».

**Гутарыў ЗП**

**Пікетаванне супраць Лукашэнкі**

Маладыя кансерватары супольна з беларускімі моладзевымі арганізацыямі плануюць 16 верасня пікетаваць будынак Адміністрацыі прэзідэнта Літвы, калі там будзе праходзіць сустрэча Лукашэнкі і Грыбаўскайтэ.

## СЦІСЛА

### Чавес цягне Лукашэнку ў антыамерыканскі саюз...

Беларусь і Венесуэла павінны ўвайсці ў новы сусветны альянс. Пра гэта заявіў у Мінску прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес.

### ...і прызнаў Абхазію за $2,2 млрд

На такую суму Масква пракрэдытуе для Каракаса закупы тэхнікі, у тым ліку ракет дальнасцю да 300 км. Аб прызнанні Абхазіі Чавес заявіў у Маскве. Венесуэла стала трэцяй краінай пасля Расіі і Нікарагуа, што прызнала занятыя расійскімі войскамі тэрыторыі незалежнымі рэспублікамі.

### «Народная воля» тры разы на тыдзень

Ад 15 верасня «Народная воля» будзе выходзіць тройчы на тыдзень. Свежы нумар газеты будзе з'яўляцца па аўторках, чацвяргах і пятніцах.

### Да «Дажынак» у Кобрыне адрамантавалі парк імя Суворава

Свята пройдзе 18—19 верасня. Да «Дажынак» у Кобрыне прывялі ў парадак больш як 400 аб'ектаў. Абнавілі парк культуры і адпачынку імя А.Суворава з летнім амфітэатрам, гатэль «Беларусь». Упершыню адчыняць свае дзверы аквапарк і лядовая арэна.

### У Магілёве няма ніводнага беларускамоўнага класа

Чыноўнікі абласнога і гарадскога аддзелаў адукацыі апраўдваюць сітуацыю адсутнасцю заяваў ад бацькоў.

### Адвакат: «Аўтуховіча трымаюць ва ўмовах, блізкіх да катавання»

Мікалая Аўтуховіча перавялі з медычнай часткі мінскага следчага ізалятара ў агульную камеру. Аўтуховіч выглядае значна схуднелым.

**ЗП, СМ**

# «Чым такую бульбу капаць, хай гніе!»

**Праз пераўвільгатненне сёлета ў краіне не ўрадзіла бульба. Месцамі немэтазгодна нават капаць яе.**

### Другі хлеб губляе пазіцыі

Сёлета масавая ўборка бульбы доўжыцца тры тыдні, а аптымізму тым, хто працуе ў сельскагаспадарчай галіне, бракуе. Летась паказнік сярэдняй ураджайнасці пераскочыў за адзнаку ў 200 цэнтнераў з гектара. Цяпер пра рэкорды гаворкі не ідзе. Хіба што пра рэкордныя цэны.

Цяпер кілаграм бульбы каштуе больш за 1000 рублёў.

### Бульба плавала ў вадзе

Намеснік генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра па бульбаводстве і плодаагародніцтве Акадэміі навук Іван Калядка тлумачыць, што ў неўраджаі перадусім вінаватыя дажджы. Ліпень бульба літаральна плавала ў вадзе. Колькасць ападкаў перавышала двух-, трохмесячныя нормы. Як вынік, развіліся інфекцыі.


PHOTO.BYMEDIA.NET

### Паратунак не для ўсіх

Калгасную бульбу апрацоўвалі хіміяй і трохі падлячылі. Але вырошчваюць бульбу перадусім прыватнікі. У сельгаскамбінатах яна займае 60 тысяч гектараў. У сялян у дзесяць разоў больш — 600 тысяч! І большасці з іх якасная хімапрацоўка недаступная. Па словах Івана Калядкі, там, дзе апрацоўка была праведзена не цалкам, страты ўраджаю могуць дасягаць 50%.

Замкнёнае кола — каб ратаваць бульбу, сялянам трэба карыстацца дарагімі прэпаратамі. Калі іх купляць, сабекошт адразу ўзлятае. Купіць на кірмашы тады выходзіць танней, чым вырошчваць самому.

Жыхарка Зэльвенскага раёна Тамара Бурак кажа: «Чым такую бульбу капаць, хай гніе! Нявартая праца. З кожнай соткі выходзіць усяго па два мяхі. Бульба дробная, толькі адна марка з ёй».

### Бульбяны эканамічны цуд

Бульба ў беларускіх рэаліях мела палітычнае значэнне. Дзякуючы ёй, у ліпені Белстат радасна адрапартаваўся — у краіне няма інфляцыі! Па афіцыйных падліках, дэфляцыя за месяц склала 0,2%. Цэны на тавары не паменшалі, але бульба, садавіна і гародніна, патаннеўшы, далі прыемны эфект. Цяпер станоўчага ўплыву на эканоміку не дачакацца. А калі бульбы ў наступным годзе будзе мала, скароцяцца і экспарт.

**Ягор Марціновіч**

**Сярэдняя ўраджайнасць бульбы за апошнія пяць гадоў**

| Год | Сярэдняя ўраджальнасць (ц з га) |
|---|---|
| 2004 | 186 |
| 2005 | 148 |
| 2006 | 166 |
| 2007 | 186 |
| 2008 | 205 |
| 2009 | 170 (прагноз) |

**Бульбу смажым, бульбу варым...**

Штогод сярэднестатыстычны беларус ужывае 180 кілаграмаў бульбы.

# Сябе паказаць

**Падчас Беларуска-літоўскага эканамічнага форуму ў Вільні дзяржава хоча і прыцягнуць замежныя грошы, і распрадаць прадукцыю.**

### Лонданскі досвед

Самай вядомай спробай уладаў зацікавіць замежных інвестараў застаецца леташні інвестыцыйны форум у Лондане. На ім палякі захацелі пабудаваць вугальную электрастанцыю ў Зэльве, англічан зацікавіла супрацоўніцтва з Беларускім металургічным заводам, а галандскі «Філіпс» выказаў жаданне разам рабіць святлодыёдную тэхніку. Чыноўнікі зрабілі выгляд, што ў захапленні ад выгляду, хоць чакалі большага.

### Балтыйскія сустрэчы

Інвестыцыйныя форумы — не ноу-хау крызісных часоў. Менавіта праз такія мерапрыемствы Беларусь спрабавала разрэкламаваць свой тавар і раней. Штогод з 2005 г. праводзяцца беларуска-латвійскія інвестыцыйныя форумы. Месца іх правядзення чаргуецца — то ў нас, то ў Латвіі.

Інвестыцый з Літвы пакуль было менш, чым з Латвіі. З адметных падзей апошняга часу — пачатак будаўніцтва ў Мінску гіпермаркета Senukai коштам $13 млн. Першы беларуска-літоўскі эканамічны форум праводзіўся яшчэ ў 2005 годзе ў Клайпедзе. Цяпер мерапрыемства атрымала статус міжнароднага.

### Такі ж, як усе

Беларускі пасол у Літве Уладзімір Дражын з сумам заўважае, што за сем месяцаў гэтага года краіны нагандлявалі толькі палову ад леташняга. Гэтага можна дасягнуць праз узнаўленне ранейшых аб'ёмаў продажаў у машынабудаванні. Увогуле ж, па яго словах, у Вільні будзе прадстаўлена прадукцыя 152 беларускіх прадпрыемстваў. Сярод іх МАЗ, МТЗ, БелАЗ.

Дражын не вылучае форум сярод чатырох, якія адбыліся ў папярэднія гады. Адзінае адрозненне — аўтарытэтнасць дэлегацыі на чале з Лукашэнкам.

У адзін час з міжнароднымі форумамі Беларусь праводзіць і абласныя. Мінскі — дык, увогуле, у той самы дзень, што і віленскі.

**ЯМ**

## Бензін падаражаў на 10%

Апошні раз цэны змяншаліся ў снежні 2008 года. На тыя самыя 10%. «Белнафтахім» адгукнуўся на падаражанне нафты, якое адбываецца апошнім часам. Для параўнання, у Расіі бензін АІ-95 каштуе 2140 беларускіх рублёў у эквіваленце. Ва Украіне, як і ў нас, — 2530 руб. У Польшчы за літр трэба аддаць каля 4300 руб.

**ЯМ**

| Цэны на бензін у Беларусі | раней | цяпер |
|---|---|---|
| Н–80 | 1760 | 1900 |
| АІ–92 | 2220 | 2470 |
| АІ–95 | 2530 | 2780 |
| АІ–98 | 3340 | 3600 |
| Дызельнае паліва | 2020 | 2220 |
| Біядызельнае паліва | 1760 | 1910 |

## СЦІСЛА

### ВУП усё ж упаў

Упершыню за 14 гадоў улады прызналі зніжэнне валавога ўнутранага прадукту. Паводле Белстата, у студзені-жніўні гэтага года ВУП скараціўся на 0,5% проці леташняга. Незалежныя эканамісты гавораць нават пра 7—8-працэнтавае падзенне.

### Дзе ў лідэрах, а дзе апошнія

У рэйтынгу Сусветнага банка Беларусь заняла чацвёртае месца па актыўнасці рэфарматарства. Эксперты ацанілі, што ў нашай краіне стала прасцей зарэгістраваць бізнэс. А вось па прастаце падаткаабкладання Беларусь зноў прызнана найгоршай краінай у свеце.

### Скарочаная праца на «Нёмане»

Паводле загада дырэктара бярозаўскага шклозавода «Нёман», на прадпрыемстве на месяц працягнуты рэжым скарочанага працоўнага часу. Людзей без папярэджання пераводзілі на чатырохгадзінную працу. Працоўныя рыхтуюць скаргу ў Дэпартамент інспекцыі працы.

### $200 на зброю з кожнага

Па падліках Стакгольмскага інстытута праблем даследавання свету, сукупныя выдаткі на ўзбраенне ўсіх дзяржаваў свету дасягаюць $1,46 трлн штогод. Вайсковыя выдаткі на кожнага чалавека ў свеце перавышаюць $200 штогод.

**ЯМ**

БЕЛАРУСЬ-ЕЎРАСАЮЗ

# Еўрапейскі інструмент суседства і партнёрства

З 2007 г. асноўны аб'ём міжнароднай тэхнічнай дапамогі ЕС Беларусі надаецца і будзе надавацца да 2013 г. праз Еўрапейскі інструмент суседства і партнёрства (ЕІПС), прызначаны для рэалізацыі Еўрапейскай палітыкі суседства (ЕПС). Аб'ёмы фінансавання, якое адрасуецца ў гэты перыяд суседнім краінам, складаюць каля 12 млрд еўра. Памер дапамогі залежыць ад патрэбаў і жадання краінаў.

ЕІПС — гэта новы адзіны механізм супрацоўніцтва для 17 усходніх і паўднёвых суседзяў, уключаючы Украіну і Беларусь.

Наданне Еўрапейскай Камісіяй (так называецца ўрад Еўрасаюза) дапамогі Беларусі рэгулюецца штогадовымі праграмамі ў рамках Еўрапейскага інструмента суседства і партнёрства (ЕІПС). На сёння аб'ём такой дапамогі значна меншы, чым у іншых краінах, што суседзяць з ЕС. Гэта тлумачыцца рознагалоссем у падыходах ЕС і Беларусі да пытанняў абароны правоў чалавека і развіцця дэмакратычнага грамадства, што абмяжоўвае магчымасці паўнавартаснага ўцягнення Беларусі ў сферу дзеяння Еўрапейскай палітыкі суседства.

Дапамога ЕС Беларусі ў рамках Нацыянальнай індыкатыўнай праграмы на 2007–2010 гг. акцэнтавана на двух прыярытэтных напрамках: 1) сацыяльнае і эканамічнае развіццё і 2) дэмакратычнае развіццё і належнае кіраванне.

На гэтыя два напрамкі з 2007 па 2010 гг. плануецца выдаткаваць 20 млн еўра, пры гэтым бюджэт прыблізна будзе размеркаваны наступным чынам:

У адносінах з Беларуссю Еўракамісія трымаецца адпаведных рашэнняў Рады Еўрасаюза, бо Беларусь пакуль не з'яўляецца паўнамаштабным удзельнікам Еўрапейскай палітыкі суседства.

Праграмы супрацоўніцтва ЕС–Беларусь на 2007–2010 гг. ахопліваюць розныя сферы дзейнасці. Гаворка ідзе пра комплекс мерапрыемстваў сацыяльнага і эканамічнага развіцця — найперш на рэгіянальным узроўні, асабліва ў раёнах, што пацярпелі ад Чарнобыля.

Як адно з найважнейшых для будучых адносінаў ЕС–Беларусь абодва бакі разглядаюць супрацоўніцтва ў адукацыйнай і гуманітарнай сферах, у першую чаргу, для моладзі. Дзейнічае праграма Erasmus Mundus — праграма супрацоўніцтва і мабільнасці ў сферы вышэйшай адукацыі, накіраваная на развіццё Еўрапейскага Саюза як сусветнага цэнтра ўдасканалення адукацыйнага працэсу. Чакаецца, што колькасць беларускіх студэнтаў і маладых навукоўцаў, якія ўдзельнічаюць у стыпендыяльных праграмах і праграмах абмену Еўрапейскай Камісіі, прыкметна ўзрасце.

Асаблівая ўвага надаецца пытанням памежнага супрацоўніцтва і эфектыўнага кіравання межамі. У прыватнасці, ідзе праца па шэрагу праектаў, накіраваных на барацьбу з гандлем людзьмі, наркотыкамі, нелегальнай іміграцыяй. Акрамя гэтага, у ЕС існуюць так званыя тэматычныя інструменты супрацоўніцтва, у прыватнасці:

– Еўрапейскі Інструмент дэмакратыі і правоў чалавека (EDIHR);

– Еўрапейскі Інструмент тэхнічнай дапамогі і абмену інфармацыяй (TAIEX);

– праграма барацьбы з нелегальнай міграцыяй (AENEAS);

– праект Erasmus Mundus і рамачная праграма «Даследаванне і развіццё»;

– Міждзяржаўная праграма транспартавання нафты і газу ў Еўропу (INOGATE);

– праграма знішчэння супрацьпяхотных мін і г.д.

# Улады рэабілітавалі Аршанскую бітву

**З 495-й гадавінай Аршанскай бітвы адбылося тое самае, што і паўтара года таму з 90-годдзем Беларускай Народнай Рэспублікі.**

БТ дало нейтральны сюжэт пра юбілей бітвы. «Звязда» расказала пра адну з бліскучых перамог беларускай зброі вуснамі прафесара Грыцкевіча і аўтара манаграфіі пра войска ВКЛ Бохана. Агенцтва «Інтэрфакс» нейтральна паведаміла пра падушачную баталію ў дзень юбілею, пры гэтым апавёўшы пра саму бітву. Сам перформанс быў дазволены гарвыканкамам — нявыгадна забараняць, калі ўсё адно ж збяруцца, а разганяць не будзеш.

Выпадковасцяў у гэтай сістэме не бывае. З 495-й гадавінай Аршанскай бітвы адбылося тое самае, што і паўтара года таму з 90-годдзем Беларускай Народнай Рэспублікі. Упершыню лукашэнкаўцы дазволілі сваім СМІ пісаць пра гэтую гістарычную падзею нейтральна або пазітыўна. І тыя ахвотна скарысталіся магчымасцю.

Яшчэ ў адным сюжэце беларускі погляд на свет і гісторыю пацясніў расійска-савецкі. Яшчэ адна перамога здабыта незалежным грамадствам. Кроплі падтачылі яшчэ адзін камень.

Бітву пад Оршай адмаўлялі, таму што яна падрывала падстаўковыя імперскія міфы. Войскам ВКЛ кіраваў праваслаўны. Тое войска бараніла сваю дзяржаўнасць. Гэная дзяржаўнасць успрымалася грамадзянамі як свая, і яны ганарыліся сваёй дзяржавай, якая давала грамадзянам большыя правы і свабоды, чым Маскоўскае княства. Каланізаваны розум не дапускаў думкі пра значэнне той найвялікшай бітвы Сярэднявечча, як і адмаўляў ролю БНР.

Працэс укаранення беларускай гістарычнай свядомасці ідзе, але да чаго паволі. Незалежны фэст на Крапівенскім полі па-ранейшаму блакуюць. Падручнікі тыражуюць савецкія схемы, рыхтуючы юнакоў да расійскага падданства. Палітычныя табу вісяць над навукоўцамі і настаўнікамі. Нацыя яшчэ толькі ў пачатку доўгай дарогі.

**Барыс Тумар**



НАСТАССЯ ШАМРЭЙ

**Каля тысячы маладых людзей сабраліся 8 верасня ў сталіцы на «бітву падушкамі» ў гонар Аршанскай бітвы. Супрацоўнікі міліцыі Цэнтральнага раёна назіралі за акцыяй збоку. У арганізатараў быў дазвол ад Мінгарвыканкама. Адзіная просьба ад супрацоўнікаў была — не ўжываць нацыянальную сімволіку. Бітва прайшла без нацыянальных сцягоў, але з неаднаразовым «Жыве Беларусь».**

# Сіліцкі: Змена ўлады ў БНФ разварушыла апазіцыйны мурашнік

**Пра змену пакаленняў у апазіцыі, пытанні ідэйнага і кадравага застою піша палітолаг Віталь Сіліцкі.**

Змена ўлады ў Беларускім Народным Фронце разварушыла апазіцыйны мурашнік і, безумоўна, стала знакавай падзеяй у асяродку апанентаў улады. Тут і выхад на палітычную авансцэну новай генерацыі, што кшталтавалася ў 1990-х, а не за савецкімі часамі, і кардынальны перадзел уплыву ў самой апазіцыі, і фактычны развал Аб'яднаных дэмакратычных сілаў. Хаця яго развалу не заўважалі хіба ў вашынгтонскім абкаме – як кансалідаваная палітычная сіла АДС скончыліся адразу пасля мінулых прэзідэнцкіх выбараў, а як дыскусійная пляцоўка апазіцыі яны шчасліва існавалі і будуць існаваць надалей.

Новы лідэр відавочна адрозніваецца ад папярэднікаў, якія, нягледзячы на ідэйнае супрацьстаянне, пераймалі багата стылёвых адметнасцяў ад колішняй партнаменклатуры. Ён стылёва апранаецца, не толькі вольна размаўляе па-ангельску, але можа весці гутарку на адной мове ў іншым сэнсе, і абсалютна не закамплексаваны ў паўсядзённым жыцці. Не цураючыся палітычнага інтрыганства, ён не бачыць у сваім апаненце ворага, якога трэба закляйміць ганьбай і нехарошымі словамі да поўнага знішчэння палітычных пазіцый і рэпутацыі.

Янукевіча не апанавала параноя яго папярэднікаў (як зянонаўскай, так і пастзянонаўскай хвалі), якія бачаць у кожнай крытыцы руку нейкіх злосных сілаў: ці то Масквы, ці то непрыязных фундатараў, якія сняць і думаюць, як зваліць яго, любімага, з верхняй жэрдачкі ў апазіцыйным седале.

Можа, змена гэтага саўковага стылю, які ўласцівы амаль усім палітыкам, што раслі і гадаваліся за савецкімі часамі, і не важна, было ім 30 ці 50 у 1991 годзе (Аляксандр Мілінкевіч, здаецца, адно з нешматлікіх выключэнняў з гэтага генерацыйнага правіла), і будзе тым бачным вынікам пераменаў у апазіцыйным асяродку. Яно і добра, бо гэты савок (схільнасць да паддывановых гульняў, паклёпніцтва, пляткарства, фантастычная здольнасць раздзімаць рознагалоссі па драбязе ў глабальныя супрацьстаянні, бачанне любога канфлікту як гульні з нулявой сумай) дастаў, мабыць, усіх, хто паводле прафесіі кантактуе з апазіцыйным асяроддзем ці нават жыве ў ім.

Памятаецца, акурат 10 гадоў таму ў беларускай апазіцыі паўстала гэтак званая «новая хваля» – група амбіцыйных маладых палітыкаў, якія абвінавацілі палітычных мастадонтаў са старой апазіцыі ў дактрынёрстве і адарванасці ад народа, пакляліся вывесці апазіцыю з палітычнай рэзервацыі, абяцалі новы стыль і новыя ідэі.

> **Савок у палітыцы: паклёпніцтва, пляткарства, здольнасць раздзімаць з мухі слана, гульні з нулявой сумай.**

Памятаеце іх імёны? Вінцук Вячорка, Анатоль Лябедзька, Віктар Івашкевіч, Мікола Статкевіч... Праз дзесяць гадоў галовы гэтых маладзёнаў пачалі пакрывацца сівізной, а пра сівізну ідэяў, стратэгій і падыходаў і размаўляць не прыходзіцца.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Аляксей Янукевіч.**

З прыходам моладзі хіба актывізавалася праца на знешніх рынках, а ўнутры краіны мы назіралі прыкладна тое ж самае — спадзяванні на тое, што вось-вось выбухне крызіс і галодны народ унясе апазіцыйных лідэраў ва ўладу на сваіх намазоленых руках. Толькі гэтага народу дзесяць гадоў таму збіралася на акцыі спачатку па трыццаць тысяч, потым па тысячы, потым па некалькі дзясяткаў, а ідэі і лідэры неяк заставаліся нязменнымі – хіба што колер шавялюры пакрысе мяняўся... І вось яны ўжо – мастадонты, дый аўтар гэтых радкоў, ветэран крытыканства і эпісталярнага пазёрства, з жахам узгадвае, што ён ужо гадамі ў тым жа ўзросце, у якім быў Вячорка ў 1999-м...

У нашым апазіцыйным балоце мы старэем разам, але шчасця ад пражытых сумесна гадоў, здаецца, не дадаецца ні ў кога.

Ці можна проста абвінаваціць тую старую новую хвалю ў палітычным непрафесіяналізме? Можна, канечне. Аднак, аддамо належнае, што іх перыяд няспраўджанага палітычнага росквіту прыйшоўся на той час, калі грамадства не толькі перастала шукаць нейкія альтэрнатывы і ўлезла ў кантракт з дзяржавай «па самыя памідоры», а наогул перастала цікавіцца палітыкай і пачало разглядаць саму палітычную дзейнасць, няважна, у якой партыі, як гарадское (ці хутчэй мястэчковае) вар'яцтва. У гэтай сітуацыі людзям, якія трапілі ў апазіцыйны асяродак, нічога не заставалася, як збягаць з яго ці за мяжу, ці пад крыло дзяржавы, ці «выбіваць» сабе нейкую шэрую зону, дзе можна было б не хадзіць на датэрміновае галасаванне, але адначасова і не атрымліваць дубцом па спіне на мітынгах. Той, хто не выплыў, але застаўся па прычыне перакананняў, мусіў улаходкваца і выжываць.

Менавіта, калі мы зразумеем, што галоўнай матывацыяй дзейнасці апазіцыйных лідэраў з'яўляецца выжыванне, і не таму, што яны дрэнныя, а таму, што з пасады лідэра палітычнай партыі ў Беларусі проста няма куды пайсці (забароны на прафесіі існуюць дэ-факта, прыватных пенсійных фондаў у краіне не водзіцца), яны трымаліся, трымаюцца і будуць трымацца за свае пасады, аджылыя партыйныя брэнды, бессэнсоўныя кааліцыі.

Вячорка зусім не агаварыўся, калі казаў пра рэйдэрскі захоп БНФ. Пры такім стане рэчаў палітычная партыя – гэта амаль прыватны бізнэс, страта якога нясе жыццёвую катастрофу.

А стаўленне да палітычнай дзейнасці як да прыватнай лавачкі натуральна выклікае яшчэ большую гідлівасць да палітыкі з боку пабочных назіральнікаў. Заўважце, у Беларусі фактычна адсутнічае палітычнае пакаленне трыццаці-саракагадовых, і тыя новыя кіраўнікі БНФ, якія прыйшлі ў партыі да ўлады, – адзіныя з нешматлікіх прадстаўнікоў гэтай генерацыі, якія яшчэ засталіся ў палітыцы. Хіба ў БНФ пакаленне ўзросту, што набліжаецца да сярэдняга, захавалася па прычыне, можа, большай ідэйнай стойкасці. У АГП гэтае пакаленне па большасці сышло хто ў бізнэс, хто за мяжу, а ў левых яго, пэўна, не вадзілася з савецкіх часоў.

Пытанне ідэйнага і кадравага застою ў апазіцыі, такім чынам – гэта пытанне не столькі кадравае, колькі структурнае.

Палітычныя лідэры – такія ж закладнікі гэтай сітуацыі, як і незалежнае грамадства, якое губляе надзею, што апазіцыя калісьці зможа дамагчыся зменаў. Думаю, нехта з лідэраў і хацеў бы сысці сам і даць дарогу маладым, калі б было каму. А нехта з маладых не сышоў бы ў іншую дзейнасць, калі б пабачыў, што ратацыя кадраў у апазіцыі існуе не толькі раз у дзесяць гадоў.

> **З пасады лідэра палітычнай партыі ў Беларусі проста няма куды пайсці.**

Пакаленне «Маладога фронту» прыходзіць на голы палітычны ландшафт. Заўтра ім прыйдзецца займацца разваленымі структурамі, неаплочанымі рахункамі за офіс, наездамі Мінюста і іншай цягамоцінай, а галоўнае — рабіць нешта з атмасферай руцінізаванай безнадзейнасці, ад якой нават у самага заўзятага ідэаліста могуць рукі апусціцца.

Хуткіх палітычных вынікаў ад іх чакаць неразумна, хоць адказваць за дадзеныя абяцанні ім прыйдзецца вельмі хутка. Час, калі сівізна можа пачаць пакрываць і іх галавы, ужо зусім не за гарамі. Таму дай ім бог хаця б не ўляпацца ў тую саўковую палітычную культуру, якая паглынула іх папярэднікаў.

# Забаўка за дзесяць мільёнаў

**Карэспандэнт «НН» выпрабаваў на сабе гонар сталічных уладаў — мінскую велатрасу ў першыя дні пасля яе адкрыцця. Дабраўшыся да канца трасы, ён зразумеў, што тая нікуды не вядзе.**


ЯГОР МАРЦІНОВІЧ
Мост цераз Свіслач. Не ровар вязе чалавека, а наадварот.

Веладарожку працягласцю 27 кіламетраў збіраліся рабіць досыць даўно. Бюджэт, роўны $10 млн, быў размеркаваны на некалькі гадоў. Будаўніцтва пастаянна зацягвалася, але крайні тэрмін здачы аб'екта — «Дзень горада — 2009» — прымусіў рабочых паспяшацца. У апошні дзень на трасу выйшлі сотні чалавек, каб працаваць, і дзесяткі, каб іх падганяць. Стаханаўскія тэмпы далі плён. Трасу адкрылі, але дарабляць будуць яшчэ доўга.

Траса праходзіць з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход беларускай сталіцы. Будаўнікі ўдала скарысталіся Свіслаччу — амаль уся траса ідзе ўздоўж русла ракі. У гэтага рашэння ёсць як плюсы, так і мінусы. З аднаго боку, пакласці ўздоўж узбярэжжа асфальт і нанесці на яго разметку было нескладана. З іншага — веладарожка аказалася ізаляванай ад астатніх дарог. Трапіўшы на яе аднойчы, з'ехаць не так і проста — траса не мае ніводнага адгалінавання.

## Дарога на хакей?

Велатрасу можна ўспрымаць як своеасаблівы экскурсійны маршрут. Калі турыст вырашыць пазнаёміцца з беларускай сталіцай, праехаўшы на ровары тыя самыя 27 кіламетраў, у яго складзецца рознабаковае ўражанне пра Мінск. Пабачыць і велічныя офісныя цэнтры, і цяністыя паркі, і гароды ў двух-трох метрах ад трасы, і спальны раён.

Веладарожка пачынаецца недалёка ад прэзідэнцкай рэзідэнцыі ў Драздах. Калі ўлічваць, што яе канец непадалёк ад мікрараёна Чыжоўка, дзе праз пяць гадоў будуць праводзіцца гульні Чэмпіяната свету па хакеі, можна лічыць удалым жарт, што велатраса патрэбна Лукашэнку толькі каб ездзіць на хакей.

## Ад Драздоў да цэнтра. Мінск зялёны і Мінск сучасны

Траса ўяўляе сабой дарожку, падзеленую «двайной суцэльнай» лініяй — па паласе ў кожны бок. Кірункі пазначаныя стрэлкамі. Звычайна збоку пакладзена плітка для мінакоў. Тыя даволі хутка зразумелі правілы «гульні». Не адыйдзеш загадзя на «сваю» паласу — атрымаеш порцыю праклёнаў ад раварыста. Калі не пашанцуе, і наехаць могуць.

Уздоўж трасы мусяць з'явіцца веластаянкі і пункты пракату ровараў, але пакуль што яшчэ не да іх. Чым бліжэй да Драздоў, тым больш стаянак. А вось на процілеглым канцы трасы іх не відаць.

Дарожка спачатку ідзе ўздоўж праспекта Машэрава, пасля перабіраецца бліжэй да Свіслачы. Вось так, чаргуючы урбаністычныя пейзажы і краявіды ракі, раварысты едуць да цэнтра горада.

У гэтай частцы дарогі праекціроўшчыкі далі волю фантазіі. Тут і пастаянныя скокі ўверх-уніз, і хаатычныя павароты, і аб'езды нясцных перашкод.

Каля стэлы дарожка раптоўна губляецца. Вакол няма ніякіх указальнікаў. Іншагародні турыст разгубіцца: куды ж ехаць далей? Аказваецца, траса цішком завярнула да Свіслачы.

Каля Палаца спорту па велатрасе едзе мікрааўтобус з міліцыянтамі. Пабачыўшы ровар, які рухаецца насустрач, міліцыянты ветліва збочылі, каб не замінаць мне і не прымушаць знізіць хуткасць. Тамая іх рэакцыя не магла не радаваць. Роварная дарожка — для ровараў.


АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ
Трасу здалі, але працягваюць дарабляць.


ЯГОР МАРЦІНОВІЧ
Парк Купалы — адзінае месца, дзе трасу не ўдалося правесці па набярэжнай.




Асфальт пакуль што раўнюткі. Каб раварыстам не было сумна ехаць па простай дарозе, будаўнікі скрывілі яе. Траса добра кружляе. Перасячэнне з вуліцай Купалы — першая праблема. Тут будаўнікі не змаглі правесці трасу па набярэжнай, таму раварыстам давядзецца пераводзіць свой транспарт праз дарогу для аўтамабіляў. Нязручна, але аптымізму дадае той факт, што такі ўчастак толькі адзін на працягу трасы.

## Ад цэнтра да Серабранкі. Мінск індустрыйны

Далей узнікаюць іншыя перашкоды. Найбольш праблем з новапабудаванымі мастамі. Каля іх траса зварочвае перпендыкулярна і адразу ж ўзлятае на высачэзны пад'ём. Выглядае сапраўды экстрэмальна, нават прафесійным раварыстам не ўдаецца ўскочыць злёту на горку. Што ж казаць пра аматараў?.. Два дзядкі на «Буслах» марна спрабавалі заехаць на адзін з такіх масткоў. Пакракталі, пазмагаліся, але ўсё ж злезлі з ровараў і ўсцягнулі іх наверх на руках. Далей наступнае заданне. Як з таго самага высачэзнага ўхілу з'ехаць і зноў-такі павярнуць на 90 градусаў? Застаецца ўперціся ў тармазы і павольна, рызыкуючы, кульнуцца праз галаву...

Тым часам траса паварочвае да стадыёна «Дынама» і студэнцкага гарадка. Цэнтр скончаны. Наперадзе — індустрыйны Мінск. Вакол заводы і фабрыкі. Але не ўсё ж турысту праспекты ды храмы паказваць.

## Серабранка. Мінск вясковы і Мінск спальны

Неўзабаве турыст зможа ўбачыць гароды. У градах корпаюцца жанчынкі. «Вам велатраса не замінае?» — пытаюся ў іх. «Цяпер не. Дзякуй богу, што будоўля скончылася... Але які дурань тут катацца будзе?» — аптымістычна настроены яны.

Праекціроўшчыкі не прадумалі павароты. Некаторыя даволі рэзкія, і ў дадатак агляду замінаюць дрэвы. Калі тут сустрэнуцца два веласіпедысты — чакай непрыемнасцяў. Калі выйдзе пешаход — яшчэ горш. Хуткасці ў раварыстаў на такіх участках даходзяць да 30—35 км/г, а чалавеку з дарогі адскочыць няма куды.

Зрэшты, напаміны пра бяспеку ёсць. У месцах, дзе траса падыходзіць да вады вельмі блізка, стаіць агароджа.

Серабранка — адзіны ўзгорысты раён на ўсёй працягласці дарогі.

Траса абыходзіць дамы спальнага раёна і кіруецца да Чыжоўскага вадасховішча. Уперадзе бачна нейкае разваротнае кола. Пад'язджаю — і становіцца зразумелым, што тут траса сканчваецца. Проста ў чыстым полі. Збочыць кудысьці да «цывілізацыі» — хаця б у тую спальную Серабранку — складана, бо вакол горы. На ровары па іх асабліва не паскачаш. Яшчэ адна значная недапрацоўка праектавальнікаў.

У супрацьлеглым канцы трасы — тая ж бяда. Дарожка кружляе па лесе каля МКАДа і раптоўна сканчваецца. «Уцякаць» няма куды...

## Забаўка, а не дапамога

Прыходзіцца развяртацца і ехаць у адваротны бок. Але тут узнікае праблема, як вяртацца дамоў? Траса ўзводзілася з надзеяй, што раварысты перастануць гойсаць па дарогах перад аўтамабілямі.

Пракаціцца праз увесь горад цікава, але інакш чым забаўкай, велатрасу назваць нельга. Таму, хто едзе на ровары на працу, яна не дапаможа нічым. Застаецца спадзявацца, што ўслед такія ж трасы ўзнікнуць і ў іншых кірунках. Калі ж яны нарэшце будуць аб'яднаныя ў сетку, толькі тады можна будзе назваць Мінск горадам, адаптаваным для раварыстаў.

**Ягор Марціновіч**

**Што можна ўбачыць па дарозе?**

- «Мінск-арэна»
- Футбольны манеж
- Камсамольскае возера
- Стэла «Мінск — горад-герой»
- Палац спорту
- Востраў слёз
- Траецкае прадмесце
- Кафедральны сабор
- Парк імя Янкі Купалы, помнік Купалу і пленэр скульптураў
- Парк імя Горкага
- Стадыён «Дынама»

# Сяргей Дубавец: Лукашэнка ўвасабляе краіну і народ

17 верасня спаўняецца 50 гадоў першаму рэдактару адноўленай «Нашай Нівы» Сяргею Дубаўцу. За дзень да гэтага, у сераду, у Белдзяржфілармоніі ў зале Рыгора Шырмы ў 18:00 пройдзе прэзентацыя новай кнігі Дубаўца «Як?», што выйшла ў кніжнай серыі радыё «Свабода». Напярэдадні юбілею Сяргей Дубавец адказаў на пытанні «НН».

**«Наша Ніва»: З вышыні паўвекавога юбілею, што бачыцца найбольш важным, зробленым у жыцці?**

**Сяргей Дубавец:** Не ведаю, што такое вышыня юбілею, ніяк гэта з сабой не стасую. Маё жыццё не лінейнае, яно як хвост яшчаркі. Кожныя 10—13 гадоў пачынаецца новае, а ранейшае ўжо не маё, а чыёсьці. Няхай хтосьці і разбіраецца, што там зроблена і што важнае.

**«НН»: А аб чым-небудзь шкадуеце, нешта хацелася б зрабіць інакш?**

**СД:** Я веру ў лёс. А лёс мяне ўсё жыццё здзіўляў толькі ў лепшы бок. Сэнкс э лот, сэр. Спадзяюся, так будзе і далей.

**«НН»: 16 верасня ў Літву прыязджае Лукашэнка. Якое Ваша стаўленне да гэтага візіту? Ці правільна, на Вашу думку, робіць Захад, пачаўшы збліжэнне з Лукашэнкам?**

**СД:** Лукашэнка ўвасабляе краіну і народ, нас з табой. Так выйшла, і ніхто гэтае дадзенасці не перамог, як ні стараліся. А калі так, дык чым больш адкрытым і блізкім будзе для нас свет, тым лепей, бо гэта першая ўмова таго, што нам вальней будзе жыць у сябе дома.

**«НН»: А што рабіць апазіцыі, ці варта ёй удзельнічаць у наступных прэзідэнцкіх выбарах?**

**СД:** Варта ўдзельнічаць ва ўсім, што спрыяе пашырэнню беларушчыны.

**«НН»: А калі прэзідэнт Беларусі пачне размаўляць па-беларуску?**

**СД:** Або пасля таго, як па-беларуску загаворыць апазіцыя, або пасля таго, як апазіцыя перастане штонебудзь значыць.

**«НН»: Як спыніць русіфікацыю?**

**СД:** Русіфікацыя — з'ява субардынацыйная. Калі ты па-за субардынацыяй, лічы, што ты яе спыніў.

**«НН»: Хто сёння ёсць увасабленнем беларускага нацыяналізму?**

**СД:** Мова.

**«НН»: У адным з нядаўніх эсэ Вы напісалі, што мы цяпер жывём у блаславёныя часы. Няўжо беларусы не здольныя на большае?**

**СД:** Лепшых часоў за гэтыя ў агляднай гісторыі не было.

**«НН»: Некалі Вы прапанавалі формулу Беларушчыны «мова—вёска—Вільня». Ці час не паказаў яе памылковасць?**

**СД:** Не. Мова нас лучыць і адрознівае ад іншых (а што яшчэ?). Вёска — наша метафізічная зямля і наша метафізічнае цела, на чым стаім і чым ёсць самі. Вільня — наш Арарат, наша вяршыня па-над далінаю Беларусі, горад нашых самых высокіх мараў і самых патаемных жаданняў. У беларускай паэзіі ёсць толькі адзін горад-вобраз — Вільня.

**«НН»: А што ўласна беларускага яшчэ засталося ў Вільні?**

**СД:** Тое, што і было заўсёды — сям'я, школа, царква, рынак, мастакі і паэты... Ну і пяць тысяч памятных мясцін гісторыі і культуры.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Сяргей Дубавец**

нарадзіўся 17 верасня 1959 у Мазыры. У Мінск пераехаў з бацькамі яшчэ ў дзяцінстве. Скончыў журфак БДУ (1984). Быў адным з заснавальнікаў «Майстроўні». Служыў у Савецкім войску. З 1980 разам з Вінцуком Вячоркам і Сержуком Сокалавым-Воюшам рабіў самвыдатаўскі праект «Люстра дзён». Быў рэдактарам газеты «Свабода». Ад 1990 жыве ў Вільні. З 1991 па 1999 галоўны рэдактар «Нашай Нівы», выхад якой аднавіў.

**«НН»: Што з маладой беларускай літаратуры стала для Вас пазітыўным адкрыццём апошніх гадоў?**

**СД:** Крыху раней Жыбуль. Цяпер Рыжкоў, які не эпатуе, але здзіўляе. Хадановіч — наш Маршак. «Гры мудрацы ў адным тазу»...

**«НН»: Чаму часы незалежнасці не далі пісьменнікаў узроўню Адамчыка, Мележа, Танка? Чаму так мала раманаў пішацца?**

**СД:** Такія рэчы не інспіруюцца. Яны ёсць або не. Мы можам гаварыць пра інфраструктуру. Скажам, Сева Сцебурака можа выкачацца ў суперскага паэта. А Паліна Качаткова ў класнага празаіка. Хто ім падкіруе шлях і рэальна дапаможа? Раней гэтым займаліся часопісы. У часопісах працавалі Алесі Масарэнкі — Яны Прадцечы, якіх «завадзіла» ад наступнікаў, а не ад саміх сябе. Сёння такога няма. Дайце мне часопіс, і я дам вам Адамчыкаў і Мележаў. Новых, натуральна. Не ведаю, ці насамрэч раманы для таго, каб характарызаваць эпоху, і ці гэтага мы ў іх шукаем. Якраз эпоху ў Адамчыка і Мележа хочацца падкарэктаваць здаля.

**«НН»: Ці пішацца Ваш раман?**

**СД:** Гэта сённяшнія «Бесы». Пры спрыяльным збегу абставінаў я іх дапішу.

**«НН»: Чаго Вам не хапае ў беларускай культуры?**

**СД:** Мне ўсяго хапае. Культуры не хапае здаровай экспансіі, адпаведных жанраў і формаў. Але гэта яе пытанне да мяне.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

# Вайна з памяццю

Крыжы, пастаўленыя пад Вілейкай на месцы расстрэлу Расціслава Лапіцкага, прастаялі толькі тыдзень.



22-гадовы Лапіцкі быў закатаваны саветамі ў 1950 годзе за стварэнне падпольнай арганізацыі, якая агітавала за незалежнасць Беларусі.

«10 верасня мясцовыя жыхары нам патэлефанавалі, што старшыня Асіпавіцкага сельсавета Мікалай Гіль разам з участковым міліцыянерам у СВК узялі транспарт і паехалі рушыць крыжы, — распавядае адзін з ініцыятараў ушанавання **Аляксей Сюдак (на фота)**. — Мы кінуліся ў Красны Беражок, але крыжоў ужо не было».

Крыжы паўсталі 1 верасня, на дзень нараджэння Расціслава Лапіцкага (гл. «НН» №34). Трэці з'явіўся за дзень да знішчэння. Крыжы асвяціў праваслаўны святар.

Мемарыяльны камень летась прастаяў даўжэй — каб збурыць яго, спатрэбілася спецыяльная тэхніка. Аляксей Сюдак абяцае, што крыжы будуць ставіць наноў, колькі б іх ні бурылі.

# Мікалай Кароткі: «А вы як думаеце?»

Патлумачыць сітуацыю з крыжамі мы папрасілі намесніка старшыні Вілейскага райвыканкама па пытаннях сацыяльнай сферы і ідэалагічнай працы Мікалая Кароткага.

**Мікалай Кароткі:** Пра гэтыя крыжы ўжо ўсюды напісана і надрукавана. Што вы хочаце пачуць ад мяне?

**«НН»: Хто спрычыніўся да знішчэння крыжоў?**

**МК:** Давайце з самага пачатку разбірацца: правільна яны ўсталяваны былі ці няправільна. Давайце вызначым, што першаснае, а што другаснае. А пасля ўжо шукаць вінавата.

**«НН»: Яны былі пастаўлены незаконна?**

**МК:** А вы як думаеце?

**«НН»: Але ж каля кожнай вёскі стаяць крыжы.**

**МК:** Дык яны ўзгадняюцца ў сельсавеце. Пасля прымаецца рашэнне. І ў гарадах стаяць крыжы... На роўным месцы паднялі пытанні. А трэба дзейнічаць па парадку. Ёсць вызначаны парадак. Інакш наставіць, дзе хочуць і хто хоча.

**«НН»: Крыжы былі пастаўлены незаконна. А знішчаны па загадзе райвыканкама?**

**МК:** Усё, да пабачэння...

**Кастусь Матушыч**

# Алёна Лапіцкая: «Пры Польшчы так не душылі беларушчыну, як цяпер»

11 верасня праваслаўныя памінаюць Дзень адсячэння галавы Івана Прадцечы. У праваслаўнай традыцыі на дзень «Івана Галавасека» памінаюць бязвінна забітых. Акурат у гэты дзень 92-гадовая Алена Шарэпа-Лапіцкая ездзіла на месца расстрэлу свайго брата Расціслава.

Яны з братам нарадзіліся ў вёсцы Касута на Вілейшчыне, у сям'і праваслаўнага святара. Каля самай царквы — захавалася — стаяў дом Лапіцкіх. На яго месцы цяпер «каланісты» — так Лапіцкая называе дачнікаў. Засталіся грушка і ясень, якія яна саджала..

Каля касутоўскай царквы паставілі помнік знакамітаму ўкраінскаму гетману Піліпу Орліку, таксама ўраджэнцу Касуты. Некалі тут паўстане і памятка па Лапіцкім.

Пасля Касуты Лапіцкая паехала да вілейскай турмы (цяпер анкалагічны шпіталь), дзе ў 1950 г. сядзеў Расціслаў.

З Вілейкі скіраваліся ў Красны Беражок. На знікненне памятных крыжоў спадарыня Алена рэагуе з болем, на месца кожнага кладзе белыя хрызантэмы.

У машыне 92-гадовая жанчына разважае: «Думаю, улада памагае крыжы нішчыць, бо Лукашэнка — камуніст!.. Быў нейкі прафесар Мілінкевіч, дык той яго пасадзіў — бяца. Я сябе адчуваю не як грамадзянка ў свабоднай дзяржаве, а як у акупаванай. Пры Польшчы так не душылі беларушчыну, як цяпер».

Вандроўку скончылі ў Вілейцы. Мясцовыя актывісты нацыянальнага руху частавалі гарбатай, а спадарыня Алена захапіла для ўсіх шчодрую долю вінаграду. Пра сам офіс вілейскай нацыянальнай грамады яна сказала: «Гэта дом-крэпасць беларушчыны. А мэбля не багацейшая, чым у маім доме».

Алена Лапіцкая хоча навесну высадзіць валошкі на месцы расстрэлу Расціслава. А на суседняй хвоі зладзіць гняздо для буслоў.

**Паўліна Купрысь**

# «Немец» на чале Саюза палякаў

**Улады ўспомнілі пра Станіслава Сямашку пасля серыі скандалаў, звязаных з парадкаваннем нямецкіх могілак. Піша Вольга Жарнасек.**


PROSTO-FREE.LIVEJOURNAL.COM

**Сямашка Станіслаў Людвігавіч чалавек, які ў 1980—1985 гадах быў на заробках у Германіі.**

Прадпрымальнік. Нарадзіўся ў 1952 у Шчучынскім раёне. Скончыў Воранаўскае ПТВ, Жыровіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум і Гродзенскі сельгасінстытут. Працаваў тэхнікам на Шчучынскім аэрадроме. У 1980—1985, амаль адначасова з Пуціным, — на заробках у Германіі. Пасля вяртання заняўся прадпрымальніцкай дзейнасцю ў Шчучыне, з 1997 — у Гродне. Уладальнік гандлёва-гасцінічных комплексаў «Элен» у Шчучыне і «Сямашка» ў Гродне, будаўнічай кампаніі «Рамбудмантаж», ААТ «Універсал-груп» і ААТ «Еўрапрэстыж». Жанаты, мае дачку.

12 верасня ў Гродне адбыўся VII з'езд праўладнага Саюза палякаў у Беларусі. Старшынёй на безальтэрнатыўнай аснове абраны вядомы прадпрымальнік Станіслаў Сямашка. Яго называюць па-рознаму: гродзенцы — «чалавек-гасцініца», партнёры па бізнэсе — «немец», а шчучынцы ў размовах з намі — часам словамі негазетнага характару.

## Абраны Адміністрацыяй прэзідэнта

Сямашка з першых хвілін на новай пасадзе пачаў актыўна кідаць камяні ў бок Польшчы і незалежнага СПБ. «Непрымальна, калі адныя палякі абмяжоўваюць свабоду іншых, — заявіў ён. — Калі мы не даможамся разумення ад кіраўніцтва Польшчы, мы дойдзем да Еўрасаюза. Бо свабода для палякаў вышэй за ўсё.»

Інфармацыя пра тое, што новым старшынёй афіцыйнага Саюза палякаў стане прадпрымальнік Сямашка, з'явілася яшчэ да з'езда арганізацыі. Пра гэта ў сваім блогу напісаў старшыня Галоўнай рады незалежнага Саюза палякаў Андрэй Пачобут. Маўляў, Сямашку выклікалі ў Адміністрацыю прэзідэнта і параілі «ўзгадаць пра свае карані». Раней у польскім руху ён заўважаны не быў.

Кандыдатура гродзенскага прадпрымальніка пасуе на дадзеную пасаду. Ён валодае вялікім бізнэсам, вядомы мясцовым жыхарам, сам ён чалавек амбітны... і мае досыць цьмянае мінулае. Апошні пункт неабходны ўладам.

## На пытанні адказваў пагрозамі

Гісторыя «цьмянага мінулага» Станіслава Сямашкі вылезла 6 гадоў таму, калі журналісты газеты «Советская Белоруссия» правялі расследаванне адносна незаконнага будаўніцтва на Гродзеншчыне мемарыялаў нямецкім салдатам.

Улетку 2000 года ў Шчучыне раптоўна з'явіліся мемарыяльныя могілкі нямецкім салдатам, што загінулі падчас Другой сусветнай вайны. На мемарыяльных плітах присутнічала сімволіка Народнага саюза Германіі па даглядзе за вайсковымі магіламі. Журналісты даслалі запыт пра іх датычнасць да будаўніцтва мемарыялаў на Беларусі, але адказ засведчыў, што арганізацыя не мае ніякага дачынення да дадзенай справы.

Праз некалькі месяцаў стала вядома, што будаўніцтва могілак ажыццяўляў гродзенскі прадпрымальнік Станіслаў Сямашка. «Советская Белоруссия» надрукавала пра гэты факт паласны артыкул. Ён называўся «Бізнэс на магілках? Будаўнік незаконнага нямецкага мемарыялу ўстаноўлены, але...» ...Але крымінальная справа ў дачыненні яго, аднак, не была распачатая. Заканадаўства пакінула некалькі шчылін для ахвотных будаваць без дазволу, а можа, і іншае дапамагло (так сцвярджаюць жыхары горада).

Да таго ж, стала вядома, што прадпрымальнік пабудаваў аналагічныя мемарыялы і ў сямі іншых гарадах на Гродзеншчыне. З чаго б гэта? На спробы журналістаў высветліць праўду ў самога прадпрымальніка, той адказваў пагрозамі ў іх адрас.

Увесну 2003 года стала вядома, што мемарыял у Шчучыне знесены. Адпаведнае рашэнне падпісаў мясцовы райвыканкам.

Як удалося высветліць гродзенскай пракуратуры, гісторыя пачалася яшчэ ў канцы 1990-х. Пасля паездкі ў Германію Станіслаў Сямашка заключыў дамову пра добраўпарадкаванне нямецкага захавання часоў Першай сусветнай вайны ў Гродне. Спачатку ўсё было законна: ён звярнуўся ў гарвыканкам, які дазволіў рэканструкцыю пры выкананні неабходных умоваў. Але Сямашка распачаў працу адразу ж. Паколькі ў выканкам пасыпаліся лісты абураных гараджан (дый дакументаў прадпрымальнік не падаў), працу спынілі. Тады яго прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці, але гэта не спыніла бізнэсоўца. Ён пачаў будаваць мемарыялы ў розных раёнах.

У Парэччы і Лічыцах насамрэч маюцца захаванні нямецкіх салдатаў часоў Першай сусветнай. Сямашка ж паклаў там пліты «ахвярам Другой сусветнай вайны». Калі яго абвінавацілі ў фальсіфікацыі, надпісы былі зменены, але толькі на расійскай мове. У некалькіх месцах паўсталі мемарыялы, дзе наяўнасць парэшткаў, нагогул, ніколі не ўзгадвалася.

Устаноўлена таксама і датычнасць Нямецкага народнага саюза да дзейнасці прадпрымальніка на пачатковай стадыі. Знойдзеныя дакументы, у якіх арганізацыя просіць Сямашку быць іх прадстаўніком у Расіі і Беларусі, а таксама гарантуе аплату выкананых ім работ. Пракуратура высветліла, што пераводы грошай з Германіі не былі зафіксаваныя ні на адным з рахункаў прадпрымальніка, хаця лагічна меркаваць, што могілкі нямецкім салдатам ён абсталёўваў не за свае сродкі.

Да таго ж Сямашкам быў парушаны і Указ прэзідэнта №231 ад 30 лістапада 1994 года «Аб паляпшэнні працы па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяраў вайны», паводле якога толькі дзяржаўныя органы павінны вырашаць, дзе і якія мемарыялы ўсталёўваць.

Гэтая гісторыя ледзь не давяла да міжнароднага скандалу. Дарэчы, нямецкі бок выбачыўся перад беларусамі за інцыдэнт і прапанаваў сваю дапамогу ў яго вырашэнні.

Як бы там ні было, адказнасці за свае дзеянні Станіслаў Сямашка не панёс, а сённяшняя «Советская Белоруссия» ужо бадзёра піша пра новаабранага кіраўніка Саюза палякаў як пра «распяхавага прадпрымальніка», прынцып якога «не прасіць грошай, а разам ствараць умовы для працы».

## Прагнозы

З прыходам Сямашкі ў якасці кіраўніка СПБ раскол арганізацыі, мусіць, паглыбіцца. На гэта ўказваюць выказванні новаабранага старшыні і сам ход з'езда. Гродзенская міліцыя затрымала карэспандэнта газеты «Rzeczpospolita» Пятра Касцінскага, які прыехаў на форум. Ніводнага журналіста з Польшчы ў залу не дапусцілі. А журналісту Яну Роману не дазволілі нават апытваць людзей каля будынка, дзе праходзіла мерапрыемства.

Польскі бок цалкам праігнараваў праўладны з'езд. Прадстаўнікі пасольства на яго не прыйшлі. У польскай прэсе з'явілася некалькі негатыўных заўваг пра абранне новага старшыні і пра ягоныя варожыя заявы ў бок Польшчы. Падобна да таго, што дыялог з этнічнай радзімай у «немца» Сямашкі пакуль не ўдаецца.




**«Падваенне» Саюза палякаў у Беларусі**

адбылося ў сакавіку 2005 года, калі на чарговым установчым сходзе старшынёй арганізацыі была абраная Анжаліка Борыс. 27 жніўня ў Ваўкавыску пры падтрымцы ўладаў адбыўся паўторны з'езд. Аднак Еўрапейскі саюз польскіх аб'яднанняў не прызнаў паўторны з'езд СПБ, заявіўшы, што Анжаліка Борыс з'яўляецца паўнапраўным кіраўніком арганізацыі. З таго часу ўлады імкнуліся «прыдушыць» арганізацыю на чале з Борыс. Саму Борыс дэманізуюць на БТ, аднойчы ў яе машыне нават «знайшлі» наркотыкі. У паштовыя скрыні ў доме, дзе яна жыве, невядомыя раскідалі брыдкія ўлёткі пра яе. У той жа час, як адзначаюць прыхільнікі Борыс, з пачаткам так званай лібералізацыі ціск на арганізацыю паменшыўся.

**Старшыня Саюза палякаў не ўмее гаварыць па-польску?**

На з'ездзе ён прачытаў нейкі даклад па паперцы, а потым сказаў, што будзе прамаўляць па-расійску, і далей усё было па-расійску, піша ў сваім блогу журналіст Андрэй Пачобут. Таму ў залу і не пусцілі нікога з польскіх журналістаў, мяркуе Пачобут. Інакш гэта было б галоўнай навіной — старшынёй нацыянальнай арганізацыі паставілі чалавека, які не размаўляе па-польску!

## АД РЭДАКЦЫІ

**Чаму важна спагадаць польскай меншасці?**

Кожная этнічная ці рэлігійная меншасць робіць нашу краіну больш разнастайнай і культурна багатай. Абавязак моцнага — бараніць слабага. Так і абавязак тытульнай нацыі — дапамагаць меншыням. Таму «НН» шмат піша пра культуры і жыццё меншасцяў.

**Чаму няправільна, каб дзяржава кантралявала СПБ?**

Нацыя і краіна моцныя тады, калі яны з'яднаныя не толькі моцнай уладай зверху, а моцнымі супольнасцямі знізу. Дзяржава стварaецца своеасаблівай «дамовай грамадзянаў», якія дэлегуюць ёй частку сваіх правоў і бяруць перад ёй пэўныя абавязкі. Самыя заможныя і дынамічныя супольнасці паўсталі на Захадзе — акурат там, дзе моцная грамадзянская супольнасць. Грамадства павінна быць першасным, а дзяржава — другасным. Інакш пачынаюцца злоўжыванні ўладай, а чалавек робіцца вінцікам.




# Спецназ абараніў расійскія войскі

PHOTO.BYMEDIA.NET

**9 верасня на Кастрычніцкай плошчы прайшла акцыя пратэсту супраць уводу на тэрыторыю Беларусі расійскіх войскаў у рамках вучэнняў «Захад–2009».**

Яе арганізатарамі былі «Еўрапейская Беларусь» з «Маладым фронтам».

Не паспелі дэманстранты разгарнуць расцяжкі «Russian army, go home!», як да іх падбеглі амапаўцы і пачалі запіхваць у аўтазакі. Некаторых пратэстоўцаў моцна збілі. Змітру Бародку з Барысава зламалі нос.

Усяго затрымалі 17 чалавек, сярод іх Зміцер Бандарэнка («Хартыя-97»), Зміцер Дашкевіч («Малады фронт»), Віктар Івашкевіч (Партыя БНФ). Да гадзіны ночы яны знаходзіліся ў пастарунку, а потым іх перавезлі ў ізалятар на Акрэсціна.

На наступны дзень суддзі Цэнтральнага раёна Мінска асудзілі затрыманых да розных штрафаў (ад 5 да 25 базавых велічыняў). Агулам апазіцыянерам прысудзілі 199 базавых велічынь, што складае 9 мільёнаў 965 тысяч рублёў. Вось табе і свабода думкі.

**ЗП**

# Юра Дземідовіч сыграе ў беларускім фільме жахаў

Яго здымае аўтар «Акупацыі» Андрэй Кудзіненка.



АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

Праз зялёныя голкі прабіваецца сонца. Святар-уцякач туманнаю раніцай крочыць па лясной дарозе. **Насустрач яму выходзяць італьянскія партызаны-гарыбальдзійцы (на фота).** Святар падсаджваецца на вазок, змагары ўрачыста рухаюцца па дарозе.

Гэта фінальныя кадры фільма «Масакра», здымкі якога пачаліся 14 верасня. Італьянскім лесам сталася алея туй у Батанічным садзе, зухаватага святара сыграў актор Аляксандр Колбышаў. Канём кіраваў рэжысёр Андрэй Кудзіненка ў касцюме кучара, а партызанамі выступілі іншыя ўдзельнікі здымачнай групы: аператар Аляксей Убейвоўк, мантажнік Аляксандр Дэбалюк, мастакі Артур Клінаў і Антон Гвоздзікаў. Музыка Сяргей Пукст граў на мандаліне Вердзі.

Новая стужка «Масакра» паводле матываў «Локіса» Праспера Мэрымэ — гатычная трагікамедыя жахаў. Як кажа сам рэжысёр — бульба-хорар, калі і страшна, і смешна. Дзеянне фільма адбываецца ў Беларусі пасля паўстання Каліноўскага. Але вайна не завершаная. Акупанты сутыкнуцца з мядзведзямі-пярэваратнямі.

Журналісты атакуюць рэжысёра: «А кроў калі будзе? А адмысловыя эфекты? А кіпцюры і зубы чалавека-мядзведзя?»

«Мядзведзь Сцяпан будзе», — не жадае раскрываць карты творца.

У новай карціне граюць Аляксандр Колбышаў, Святлана Зелянкоўская, Сяргей Журавель.

Запрошаны ў карціну і малы спявак Юры Дземідовіч. Як паведаміў Андрэй Кудзіненка, у карціне вакантная роля хлопчыка, якога па сцэнары таксама клічуць Юрам. Хлопчыку ідэя зняцца ў кіно спадабалася, адно пратэстуюць куратары з БТ — баяцца, каб спявак не прастыў перад «Еўрабачаннем».

На «Масакру» выдзелена 5 млрд рублёў. Здымкі мусяць завяршыцца 27 снежня, а здача карціны запланаваная на 2 ліпеня налета.

**Андрэй Расінскі**

# Глен сказаў: «Паехалі!»

Мінскае «Дынама» выйграла першы матч у новым сезоне Кантынентальнай хакейнай лігі. 14 верасня гадунцы Глена Хэнлана перамаглі «Салават Юлаеў» у серыі булітаў з лікам 3:2 (0:0, 2:1, 0:1, 0:0, 1:0).

«Дынама» набірае першыя два балы, менавіта столькі даецца за перамогу ў овертайме ці па булітах. Але каб выйгралі ў асноўны час, было б тры балы. Першы матч у суботу мінчукі прайгралі ў Санкт-Пецярбургу мясцоваму СКА з лікам 0:2.

У Заходняй канферэнцыі «Дынама» займае 10 радок з 12.

Наступны матч «Дынама» правядзе ў сераду, 16 верасня, супраць «Авангарда». У пятніцу, 18 верасня, гульня з казахстанскім «Барысам».

Потым — тры гульні ў гасцях. Затым зноў некалькі матчаў у Мінску. Першы ў Мінску — 30 верасня з «Атлантам».

Да пераезду ў «Мінск-Арэну» гульні праходзяць у Палацы спорту. Пачатак а 19-й.

**ЗП**

# У Кіеў паедзе «Чароўны трусік»

Па 12 балаў усім удзельнікам адбору на «Дзіцячае Еўрабачанне» налічылі адразу ж перад галасаваннем. Каб крыўдна не было. Найвышэйшыя балы Юрыю Дземідовічу **(на фота)** падарылі Брэст, Віцебск і Мінск. Па 8 балаў далі Гродна і Магілёў, 10 — Гомель. І свае 12 балаў дадало журы.

Як гэта ні сумна, ніводзін з канкурсантаў не праспяваў па-беларуску. Песенька пераможцы беларускага адборачнага конкурсу, дзякуючы літаратару Сяргею Балахонаву, загучала і на роднай мове. Але толькі ў межах праекта «Тузін. Перазагрузка».

Дзіцячы конкурс «Еўрабачанне-2009» пройдзе 21 лістапада ў Кіеве.

**СП**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Відэа фіналу можна пабачыць на сайце nn.by

## СЦІСЛА

### На Гомельшчыне кавуны крадуць сотнямі

Распачатыя дзве крымінальныя справы па фактах масавага крадзяжу з гародаў. У жыхаркі Акцябрскага (Рудабелкі) за два дні з агарода скралі аж сто сакавітых гігантцкіх ягадаў. Кавуны агульнай вагой 200 кг прапалі з гародчыка ў Лоеўскім раёне.

Кавуны сталі масава вырошчваць з пацяпленнем клімату і з'яўленнем раянаваных гатункаў.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Неймаверная канцэнтрацыя прыгажосці ў сталіцы: конкурс на конкурсе едзе і конкурсам паганяе. 70 удзельніц конкурсу «Інтэркантыненталь-2009» сабраліся з усяго свету. Беларусь прадстаўляе Марыя Есьман — з валошкай у валасах.**

# І кавалак Святой Русі

**Наведайце стракатую Астравеччыну, пакуль няма АЭС. Піша Алесь Пілецкі.**



Храм у Гервятах здзіўляе 59-метровай вежай ды шыкоўным батанічным садам. А побач у Міхалішках — унутранай аздобай, якую пакінулі мастакі фларэнтыйскай школы.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Батанічны сад пры касцёле ў Гервятах.

У Слуцку ўсё па-людску,
У Оршы не горшай,
У Мінску — па-свінску,
А Астравец — гэта свету канец...

Такой прымаўкай мяне сустрэлі аднакурснікі ў Гродне, калі я прыехаў туды з Астравеччыны.

Можна крыўдаваць на такое катэгарычнае сцверджанне, але гэты памежны раён сёння насамрэч выглядае канцом беларускага свету. Мяжа тут адчуваецца ва ўсім: у вялікай колькасці памежнікаў і мытнікаў, аўтамабіляў з літоўскімі нумарамі, прадуктах і таварах з суседняй краіны, шматмоўі жыхароў і нават дзікасці мясцовай прыроды.

## Кавалкі Літвы

«Лабасы! Лабасы едуць!» Такімі крыкамі мясцовыя дзеці сустракаюць фуры і легкавікі з Літвы.

У самой Літве жыхары Астравеччыны бываюць часта, і шмат хто жыве з розніцы цэнаў там і тут. Літоўцы таксама не адстаюць — прыязджаюць за таннейшым палівам. Па той бок мяжы большасць насельніцтва размаўляе на той самай мове, што і жыхары Астравеччыны, хіба толькі польскіх словаў ужываюць больш, а расійскіх менш. Літоўскамоўныя вёскі пачынаюцца за Вільняй. Аднак і на Астравеччыне ёсць некалькі такіх, дзе можна пачуць літоўскую гутарку. Рымдзюны і Гервяты — найбольш вядомыя. Там нават дзеці малыя да сёння размаўляюць дома па-літоўску, а маштабам Літоўскага культурна-адукацыйнага цэнтра ў Рымдзюнах можна толькі пазайздросціць.

## Фэст у Гудагаі

Літоўцамі, аднак, жыхароў Астравеччыны не называюць. Часам называюць іх палякамі. Чаму тут здзіўляцца — адзіная царква на цэлы раён была пабудаваная толькі ў 1990-я гады. Раней існавала толькі стараверская царква XIX ст. у Стрыпішках, цяпер не дзейнічае. Гэта за 3 км ад мяжы са Свянцянскім раёнам Літвы. Тамтэйшая мясцовасць называецца ў нас Святая Русь. Спрэс каталікі жывуць на Астравеччыне. Праваслаўныя — гэта збольшага прыезджыя. Называюць дык называюць — нічога з тым не паробіш. А вось польскую мову ў ваколіцах Астраўца пачуць складана. Толькі палякі-ксяндзы да паствы на ёй звяртаюцца, дый то нядоўга.

У Гудагаі можна пабачыць абраз Маці Божай Гудагайскай, які быў каранаваны ў 2007 годзе. Тамсама месціцца невялічкі жаночы кляштар кармелітаў. Штогод 16 ліпеня ў Гудагаі ладзяць вялікі фэст. Самым відовішчным дзействам фэсту з'яўляецца адмысловая працэсія, пад час якой па мястэчку праносяць каранаваны абраз. Гэтае свята вартае увагі — атмасфера неперадавальная.

Ад этнографа Марыюша Кавальскага мне давялося чуць, што на Астравеччыне ён сустрэў самых беларускіх беларусаў ва ўсёй краіне. Можа, яно і так. Не раз даводзілася чуць, як мясцовыя падлеткі смяюцца з набытай ў гарадах старэйшымі землякамі расійшчыны. Мой бацька, калі малы бегаў, называўся Алесем, і толькі ў школе настаўнікі зрабілі з яго Сашу.

## Вёскі, прырода і людзі

Назвы вёсак на Астравеччыне перадаюць спадчыну розных плямёнаў, нашчадкі якіх зліліся ў беларускі этнас, — славянскіх і балцкіх. Астравеччына якраз была ў сэрцы балцкага Нальшчанскага княства. Гудагай — ад літоўскага «гудас». Гудамі даўней літоўцы называлі беларусаў. На поўдзень ад балтаў рухаліся ад Балтыкі да Чарнамор'я готы, і беларусы назаўжды засталіся ў этнічнай памяці літоўцаў готамі — гудамі.

Байканы размешчаныя ўсяго за два кіламетры ад Дайноўкі, назва якой паказвае, што тут некалі асяліліся выхадцы з летапіснага племені Дайнава, ад літоўскага «dainuoti» — што значыць «спяваць». Акрамя вёсак, яшчэ процьма жылых і закінутых хутароў. Цэны на нерухомасць рэзка завагаліся пасля вестак аб будаўніцтве АЭС.

## Сарачанскія азёры

Калі адмыслова ехаць на Астравеччыну з мэтай адпачыць блізка да прыроды, то для гэтага варта выбраць паўночную частку раёна. Там месцяцца Сарачанскія азёры — ажно 12 вадаёмаў, злучаных паміж сабой пратокамі. Асабліва маляўніча выглядаюць азёры Тумскае, Ёдзі і Белае. Ніякая цывілізацыя сюды пакуль не дабралася. Навокал ціша.

## Радзіма Сваяка, Мальдзіса

Ёсць на Астравеччыне і мясціны, дзе гадаваліся вядомыя людзі.

У самім Астраўцы і Малях усталяваныя помнікі Язэпу Гашкевічу — першаму расійскаму консулу ў Японіі, аўтару першага расійска-японскага слоўніка. Гашкевіч атрымаў Малі за сваю службу Расійскай імперыі, а нарадзіўся ён у Рэчыцкім павеце.

Вёска Барані вядомая як малая радзіма Казіміра Сваяка — ксяндза, паэта і дзеяча нацыянальнага руху, у Клюшчанах ён сядзеў у глухой парафіі ў фактычнай ссылцы пры Польшчы.

А ў Расолах, дзе цяпер зусім нікога не знойдзеш, у 1932 годзе нарадзіўся патрыярх беларускай гуманітарыстыкі Адам Мальдзіс.

З Астравеччынай звязаныя таксама імёны брата Казіміра Сваяка Альбіна Стаповіча — кампазітара, грамадскага дзеяча, пасла ў польскі Сойм, а таксама Адольфа Клімовіча — аднаго з лідэраў беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў.

## АЭС

Калі летась было вырашана будаваць першую беларускую АЭС на Астравеччыне, насельніцтва раёна з палёгкай уздыхнула. Чаго можна патрабаваць ад людзей, калі на цэлы раён адзінае вялікае прадпрыемства — Альхоўская кардонная фабрыка. Таму людзі і спадзяюцца на новае будаўніцтва як на адзіны шанец мець працу на бацькаўшчыне. Аб экалогіі людзі пакуль не думаюць. Вось і чакаюць у Астраўцы расійскага крэдыту на будаўніцтва той станцыі нават больш, чым у прэзідэнтуры.

Пакуль станцыі няма. Пачалі былі будаваць дамы для працаўнікоў АЭС, але спыніліся на ўзроўні катлаванаў. Злыя языкі кажуць, што станцыя пабудаваная не будзе.

## Па Астравеччыне аўтамабілем

Калі па віленскай шашы даехаць з Мінска да Ашмян, адтуль да Астравеччыны застанецца 15 кіламетраў. Пачаць вандроўку можна з касцёла ў мястэчку Гудагай. Дарэчы, мястэчка — гэта афіцыйная назва, нават на дарожным указальніку так напісана. Пасля можна наведаць барочны архітэктурны ансамбль у Варнянах. Цікавы і касцёл Узвышэння Святога Крыжа ў Быстрыцы. Першы храм тут збудавалі яшчэ ў часы Ягайлы. Неагатычны касцёл у Гервятах здзіўляе магутнай мелодыяй сценаў, 59-метровай вежай ды шыкоўным батанічным садам. А касцёл у Міхалішках — наадварот, сваёй унутранай аздобай, якую пакінулі нам знакамітыя фларэнційцы П'етра Пярэці, Джавані Марыя Галі, Андрэа Капонэ, Ян Пенс ды мясцовы майстар Мікола Жылевіч.

## Рай для ровараў

Густая сетка вёсак і хутароў робіць камфортным падарожжа па гэтым «канцы беларускага свету» на ровары. Стартаваўшы з чыгуначнай станцыі ў Гудагаі, можна праз Астравец даехаць да Гервят, адтуль у Варняны, Міхалішкі і далей на поўнач — у кірунку Сарачанскіх азёр. У цэлым працягласць маршруту складзе каля 60 кіламетраў у адзін бок. Яны дадуць ацаніць усю прыгажосць і разнастайнасць мясцовага ландшафту. У рэках уздоўж маршруту сустракаецца фарэль (стронга), а ласі проста па дарогах шпацыруюць.

**Алесь Пілецкі**

*Падзякі А.Ю. за дапамогу ў падрыхтоўцы артыкула.*

**Як атрымаць дазвол на ўезд у памежную зону**

Праз памежны Гудагай цягнікоў курсуе шмат. Праўда, Гудагай знаходзіцца ў зоне шчыльнага памежнага кантролю, і прыйдзецца паклапаціцца аб дазволе на ўезд у памежную зону. Цяпер працэдура атрымання такога дазволу спрошчаная. Дастаткова звярнуцца ў пашпартны стол па месцы жыхарства з адпаведнай заявай.




На Астравеччыне знойдзеце толькі адзін гатэль у Астраўцы, прычым з суботы на нядзелю вам не дасць заснуць вяселле ў суседняй рэстарацыі. Можна скарыстацца паслугамі аграсядзібы ў прыазёрных Клюшчанах, а таксама сядзібамі сумежных з Астравеччынай раёнаў.

**Сядзіба «Клюшчаны»**
размешчаная на тэрыторыі заказніка «Сарачанскія азёры». Сюды можна трапіць як на ўласным транспарце, так і скарыстаўшыся аўтобусам маршруту «Мінск–Свір».
Тэл. (029) 365–64–59, e-mail: kor_olga@list.ru

**Конна-спартовы цэнтр «Гіпіка»**
месціцца ў вёсцы Грынцы Ашмянскага раёна. Сюды зручна дабірацца як з Ашмян, так і з шашы Мінск–Вільня.
Тэл. (029) 355–13–73, e-mail: hippika@tut.by

**Сядзіба ў Солах**
Солы размешчаны на чыгунцы, і гэта вельмі спрашчае даезд — тут спыняецца большасць цягнікоў. Скарыстаўшыся момантам, можна наведаць месца нараджэння Ф.Багушэвіча. Непадалёк таксама знаходзяцца Крэўскі замак, Гальшаны, сядзіба Агінскіх у Залессі.
Тэл. (029) 971–40–41

# Das ist Kriwi-band



Алесь Пілецкі

Найвышэйшай формай айчыннага рока ёсць фольк. Альфа і Амега (ці «Бітлз» і «Дып Пёрпл») гэтага накірунку, «Песняры», не мудруючы, пабудавалі на народных спевах кар'еру. Неразбаўленыя прыхільнікі гітарнай электрычнасці, Слава Корань і Піт Паўлаў, пазіцыянуючы сябе як найдалей ад бабульчыных мелодыяў, не-не ды звярталіся да фальклорнага матэрыялу. А што казаць пра «залаты» супольнік рок-музыкі «Народны альбом», пра гэты рок брута, але фольк нета.

Таму няма дзіва, калі пры канцы 1990-х бліскучы «Крыві», колішняе адгалінаванне фолькмадэрнавага «Палаца», у адзін пагодны дзень былі прылічылі да самых папулярных рок-гуртоў краіны, а набудаваныя на народнай аўтэнтыцы «Хэй-лолі» і «За туманам» — адныя з найлепшых альбомаў у гісторыі беларускай рок-музыкі.

Пасля доўтага адцінку невыступаў у Беларусі «Крыві» зрабіліся хэдлайнерамі фольк-фэсту «Камяніца» пад Мінскам. Пра вяртанне, якога не было, пра новае аблічча гурту, які застаўся верны сабе, інтэрв'ю з Веранікай Кругловай.

**«Наша Ніва»: Вераніка, такім чынам, «Крыві» вяртаюцца дамоў?**

**Вераніка Круглова:** Я не вяртаюся, бо ніколі не з'язджала. Плёткі ўсё гэта, няпраўда. Можа, мой дом і там, дзе мае любыя людзі, але Радзіма адна — Беларусь. Так, збольшага я знаходзілася ў Нямеччыне: там ёсць праца, ёсць запрашэнні. Мне так прасцей. А «Крыві» як былі, так і ёсць. Як спявалі беларускі фальклор, так і спяваюць. Я заўсёды кажу падчас выступу: Das ist Kriwi-band. Wir kommen aus Belarus./Мы — гурт «Крыві», мы прыехалі з Беларусі.

**«НН»: Але адчуваеце, што цяпер дома да вас трошкі менш увагі?**

**ВК:** Адчуваем. Працоўны момант: ёсць узвівы, ёсць і падзенні. Можа, раней і быў перапынак, так бы мовіць, дэкрэтны адпачынак— у мяне нарадзілася дачка, — але асабіста для мяне нічога не скончалася і не перарывалася.

**«НН»: А якія ў вас адносіны з былымі ўдзельнікамі гурту, Юрыем Выдронкам, Зміцером Вайцюшкевічам і Пітам Паўлавым? Ці сочыце за іх далейшай творчасцю?**

**ВК:** З Выдронкам, на жаль, не падтрымліваю адносінаў. А са Зміцером і Пітам перыядычна дзенідзе сустракаемся на супольных тусоўках: на «Народным альбоме», напрыклад. Нармальныя адносіны з імі, чалавечыя. Але за іхняй творчасцю не асабліва сачу: мае інтарэсы пайшлі трохі ў другі бок.

**«НН»: Пасля таго як вы зняліся ў «Настассі Слуцкай», а вашыя песні пайшлі ў саўндтрэк стужкі, «Крыві» запрашалі на ТБ, вы раздавалі інтэрв'ю... А як цяпер у вас з масавай культурай? Ці вы пачуваецеся яе часткай?**

**ВК:** Рыбак — гэта супер, гэта добра. Але «Крыві» не поп-гурт, у нас свае пэўныя крытэры: нам не важна колькасць, важна якасць. Гэта, так бы мовіць, хто на каго вучыўся.

**«НН»: Што сабой уяўляе сучасны «Крыві»?**

**ВК:** Прафесійныя музыкі. Граем толькі беларускі фальклор, але ідзём у нагу з часам, з жыццём, з моладдзю. Маем стыль: этна-джаз, або клубнае этна, і намагаемся яго пільнавацца. Гэта адмысловы накірунак, разлічаны найперш на маладых, адаптацыя фальклорнага матэрыялу на розны густ. Апрацавалі старыя песні: «За туманам», «Добры дзень», дадалі новых. Па-іншаземнаму, па-нямецку, ёсць толькі адзін нумар, дзе рэфрэнам гучыць «Ziaziulia, ziaziulia». З нефальклорных — антываенная песня Марлен Дзітрых «А дзе ж тыя кветкі?», перакладзеная на беларускую. Пішам новы альбом, працы вядуцца цэлы год. Ездзім: Францыя, Данія, Польшча.

**«НН»: А што можаце параіць паслухаць з беларускай музыкі?**

**ВК:** Я фанатка Іван Іванавіча Кірчука. Безумоўна, «Тройца» — твар нашай краіны. А яшчэ «Гаротніца», «Джамбібум».

**«НН«: Як вам беларуская публіка? Як вам такая ідэя фольк-фэсту сярод старажытных хат?**

**ВК:** Цудоўная ідэя. Вельмі спакойна, вольна, дэмакратычна. Добры настрой, добрае паветра. Увогуле, «Крыві» хочуць выступаць дома: на фэстах, у клубах — куды запросяць...

**Гутарыў Павал Касцюкевіч**

**«Крыві» можна ўбачыць і пачуць** на іх сольным канцэрце 19 верасня ў Моладзевым тэатры эстрады (вул.Маскоўская, 18а, ст.м. «Інстытут Культуры»). Пачатак а 19-й.

## Патрык Суэйзі: праца важнейшая за боль



Тройчы намінант на «Залаты Глобус» пачынаў сваю кар'еру як танцор і спявак у мюзіклах на Брадвеі. На самым выдыху халоднай вайны ён паспеў засвяціцца ў антысавецкім фільме «Чырвоны світанак».

Зоркай Суэйзі зрабіўся, сыграўшы настаўніка танцаў у касаробе «Брудныя танцы». Да рамантычнага амплуа ён вернецца ў «Прывідзе», сваёй самай паспяховай стужцы. Ён грае забітага мужчыну, пазбаўленага цялеснае абалонкі, што кранальна бароніць каханку.

У дэтэктыўным серыяле «Звер» Суэйзі здымаўся ўжо хворым на рак падстраўнікавай залозы. Ён не прымаў болесуцішальнікаў у часе здымак, каб не нашкодзіць узроўню акторскае гульні.

**ЛК**

ДЫСКАГРАФІЯ

## Новы аўдыёдыск для дзяцей




Чакаць тэлефоннага званка з Балоны, як уласнага Дня народзінаў, калі ведаеш, што табе падаруюць доўгачаканае шчаня. Гадаць: пра што сёння распавядзе тата? Кожная яго казка па тэлефоне — захапляльная і смешная — свята фантазіі і дабрыні...

Маленькі беларус таксама можа стаць удзельнікам казачных падзеяў, пра якія італьянскай дзяўчынцы распавядае яе тата. «Казкі па тэлефоне» — так называецца аўдыёдыск, створаны паводле кнігі слыннага дзіцячага пісьменніка Джані Радары. Гэта спектакль, у якім прынялі ўдзел зоркі беларускай сцэны: Г.Аўсяннікаў, Л.Барташэвіч, З.Паўлоўская, Г.Маляўскі, А.Кашпераў. Музыку да пастаноўкі напісаў Валер Іваноў.

Дыск «Казкі па тэлефоне» ўжо з'явіўся ў кнігарнях Мінска, а таксама ў інтэрнэт-краме www.Prastora.by.

МЫ САМІ

## Адноўлены «Сцебярацкія бык»



Сябры Таварыства аховы помнікаў на Вілейшчыне аднавілі першасны выгляд старажытнага помніка «Сцебярацкія бык». Валуны сёлета былі пашкоджаны вандаламі. Помнік уяўляе сабой пяць валуноў, якія размешчаны адзін за адным па лініі поўдзень-поўнач. Камяні маглі быць паганскім капішчам або старажытным пахаваннем.

Як кажа адзін з удзельнікаў акцыі Аляксей Лужынскі, «камяні трэба даглядаць, бо ў Беларусі гэта адзіны прыклад выявы рагоў-рытонаў на камянях».

**Сяргей Макарэвіч, фота www.vialejka.org**

БІБЛІЯТЭКА

## «Калі хочаце мець у Айчыне свабоду...»




Пад такой назвай выйшаў зборнік выбранай паэзіі Алеся Чобата. Укладаў кніжку Язэп Янушкевіч.

Чобат як паэт адметны тым, што прыйшоў у літаратуру не з філфакаўскай парты. Ён скончыў тэхналагічны інстытут. Папрацаваўшы канструктарам ліцейных формаў, ён здолеў захаваць сябе і для паэзіі. Таму ў яго вершах усё проста. Няма залішняй вобразнасці. Ён піша без падтэксту — гаворыць проста, пра што думае, што баліць.

«Калі хочаце мець у Айчыне свабоду...» — гэта голас катэгарычны, але да яго варта прыслухоўвацца. Калі прачытаеце ўжо першыя вершы, адразу зразумееце, чаму зборнік выйшаў не ў дзяржвыдавецтве.

Дарэчы, 23 жніўня Алесь Чобат адзначыў 50-годдзе. Рэдакцыя «НН» далучаецца да віншаванняў.

**Пра зборнік пытайцеся праз т.: (029) 327-54-86 (Язэп).**

**СМ**

**Алесь Чобат. Калі хочаце мець у Айчыне свабоду...** — Мінск, 2009.

СЦІСЛА

### Важная знаходка ў мінскіх падзямеллях

Пры аднаўленні царквы Святога Духа знайшлі крыпты з парэшткамі фундатараў. Саму царкву знішчылі саветы, але да трунаў не дабраліся. Крыпта можа стаць сімвалам незнішчальнасці Мінска і турыстычнай перлінай. Царква Святога Духа стане яшчэ адным адноўленым будынкам плошчы Свабоды, былой Ратушнай, амаль цалкам зруйнаванай царом пасля акупацыі Беларусі, а пасля саветамі.

### Каляндар на spadchyna.org

Вывешаны ў інтэрнэце каляндар, сабраны актывістамі клуба «Спадчына». У ім пазначаныя самыя важныя падзеі ў гісторыі і культуры Беларусі.

### У Францыі — выстава беларускага фатографа

У Перпіньяне (Францыя) праходзіць Міжнародны фестываль фотажурналістыкі «Visa pour l'Image». Адна з выставаў складаецца з работ выдатнага беларускага фотажурналіста Віктара Драчова. 52-гадовы Драчоў здымае для агенцтва France-Presse.

**СМ; АП; Еўрарадыё**

# Бамбёжка Баранавіч 15 верасня 1939 года

Другая сусветная вайна прыйшла на беларускую зямельку не 22 чэрвеня 1941 г., а на два гады раней, калі Трэці Рэйх і СССР дзялілі Цэнтральную Еўропу.

15 верасня нямецкая авіяцыя бамбіла Баранавічы. Пад атаку трапілі чыгуначны вузел і радыёстанцыя.

Каля вакзала немцы знішчылі некалькі цягнікоў. Былі параненыя і забітыя.

Над радыёстанцыяй «Баранавічы» супрацьпаветранай абароне пашчасціла падстрэліць адзін з нямецкіх самалётаў DO-17, які і не дацягнуў да аэрадрома, загарэўся і разбіўся каля Растэнбурга. Радыёаператар самалёта памёр пасля ў шпіталі.

Дарэчы, на наступны дзень нямецкія самалёты бамбілі радыёстанцыю ў Вільні і здолелі спаліць яе. Тады сама яны нанеслі ўдары па адрэзку чыгункі Вільня-Баранавічы і знішчылі 2 цягнікі. На чыгунцы Баранавічы-Сарны таксама знішчаны два цягнікі. Пад удар трапляе чыгуначны вузел Маладзечна.

Найноўшая ў Польшчы (пачала працу ў верасні 1938-га) радыёстанцыя знаходзілася на ўскрайку Баранавіч. Будынак, дарэчы, захаваўся. Толькі цяпер гэта цэнтр горада, раён Старога парку. Польскія ўлады выкарыстоўвалі станцыю для прапаганды пальшчызны. Ставілі польскую музыку, выступалі польскія жаўнеры, навукоўцы і знакамітасці. Вяліся перадачы для земляробаў. Вядома, што была адмысловая забарона прайгравання на Баранавіцкім радыё беларускіх кружэлак Забэйды-Суміцкага.

Непашкоджаная нямецкай авіяцыяй радыёстанцыя скончыла працу праз два дні — 17 верасня. Польская выведка паведамляла, што сувязь з радыёстанцыяй перарваная.



Цырымонія змены варты ў Брэсце з нямецкай на савецкую. 22 верасня 1939 года.

Станцыя дасталася саветам. Як згадваў у сваёй дакладной старшыня радыёкамітэта БССР Якельчык 11 верасня 1940 года: «Наяўнасць радыёстанцыі ў Баранавічах дазваляла не толькі рэтрансляваць перадачы Масквы і Мінска, але і давала магчымасць весці адмысловыя перадачы на Заходнія вобласці. У сувязі з гэтым праводзілася мясцовае вяшчанне, якое займала 3-4 гадзіны штодня. Туды ўваходзілі два выпускі «Апошніх навінаў» на беларускай мове і па адным на габрэйскай і польскай мовах. Каля паўгадзіны на дзень адводзілася на гутаркі, што вяліся згодна з аддзелам прапаганды і агітацыі».

**Руслан Равяка**



СА ЗБОРАЎ ГЕНРЫХА БЕРАЗОЎСКАГА, ПОЛЬШЧА.

**Бліжэй да левага ніжняга краю здымка відаць радыёвежа. Здымак выкананы пілотам Luftwaffe падчас бамбёжкі Баранавіч.**

**У гадавіну аб'яднання БССР праз Баранавіцкую радыёстанцыю праводзіліся наступныя перадачы, што прымаліся ўсімі радыёвузламі заходніх абласцей:**

1. Выступ сакратара Баранавіцкага абкама КП(б)Б т.Тура на тэму «С какими достижениями приходит Барановичская область ко дню освобождения от ига польских помещиков и капиталистов».
2. Выступ дэпутата Вярхоўнага Савета СССР т. Сяржанта на тэму «Мая дэпутацкая дзейнасць».
3. Выступ кіраўнікоў буйных прадпрыемстваў на тэму «С чем мы встречаем первую годовщину освобождения Западной Белоруссии».
4. Мастацкая самадзейнасць гарадоў Баранавічы, Брэст, Беласток, Ляхавіцкага раёна, в. Падлессе і г.д.
5. Літаратурна-музычныя перадачы на тэмы «Чырвоная Армія — армія-вызваліцельніца», «Вызвалены народ», «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці», «Савецкія дзеці самыя шчаслівыя дзеці ў свеце».

# Пакінуць вайну

### 3 верасня ў Мінскім Міжнародным адукацыйным цэнтры прайшла канферэнцыя «Акупацыя Польшчы ў 1939 годзе: шляхі прымірэння».

Першы дакладчык, Рыгор Лазько з Гомельскага ўніверсітэта, адзначыў, што не цалкам згодны з такой пастаноўкай праблемы. На яго погляд, не можа быць размовы аб прымірэнні, калі канфлікту, маючага карэнні ў верасьнёўскіх падзеях 1939 года, у сучаснай Беларусі напросту не існуе. Так, як не існавала беларускай дзяржавы ў тыя часы. Натуральна, што Беларусь не можа разглядацца як удзельніца акупацыі Польшчы.

Спадар Лазько таксама зазначыў, што «паход савецкай арміі ў верасні 1939 года нельга назваць адназначна вызваленчым. Такая трактоўка патрабуе карэкцыі. Беларусь з-пад польскай адміністрацыі трапіла пад савецкую. Гэта нельга назваць вызваленнем».

Становішча польскага насельніцтва на землях Заходняй Беларусі ацэньваў Войцех Сляшынскі з Беластоцкага ўніверсітэта. Паводле польскага даследчыка, беларусы не неслі пагрозы польскай адміністрацыі ў верасні 1939 года. Ніякіх антыпольскіх выступаў у першыя тыдні вайны не было — яны пачаліся толькі непасрэдна перад наступленнем савецкіх войск.

Спадар Сляшынскі адзначыў, што «пасля савецкай акупацыі Заходняй Беларусі колькасць палітычна матываваных забойстваў прадстаўнікоў польскай адміністрацыі тут значна пераўзыходзіла колькасць аналагічных забойстваў на землях Заходняй Украіны, што даволі нечакана».

В.Сляшынскі таксама гаварыў аб памылковай палітыцы польскіх уладаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі, што стала адным з фактараў прыязнага стаўлення беларускага і жыдоўскага насельніцтва да новай улады.

У дыскусіі, якая распачалася пасля выступаў дакладчыкаў, было закранутае пытанне сапраўднага часу ўз'яднання Заходняй Беларусі і Беларусі Савецкай. Георгій Лазько падсумаваў, што можна гаварыць аб трох этапах аб'яднання. Першы — 17 верасня 1939 года, калі адбылося падпарадкаванне Заходняй Беларусі савецкай адміністрацыі. Другі — канец кастрычніка 1939 года, калі са згоды Народнага Сходу Заходняй Беларусі адбылося юрыдычнае афармленне ўз'яднання і трэці этап — 1941 год — калі перастала існаваць ахоўваная мяжа паміж Беларуссю Заходняй і Савецкай.

**Палітычна матываваных забойстваў прадстаўнікоў польскай адміністрацыі ў 1939-м у Заходняй Беларусі было больш, чым у Заходняй Украіне.**

Другая частка канферэнцыі была прысвечаная абмеркаванню шляхоў прымірэння. Асаблівае значэнне такому дыялогу надавала прысутнасць у зале прадстаўнікоў розных краін, што ўдзельнічалі ў вайне. Прамаўлялі таксама прадстаўнікі праваслаўнай царквы і каталіцкага касцёла, яўрэйскай меншасці. Кожны бок гаварыў аб сваім разуменні падзей верасня 1939 г. і ўсёй вайны. У адрозненне ад сухіх прамоваў гісторыкаў, што гучалі ў першай частцы канферэнцыі, выступы наведнікаў былі больш эмацыйнымі.

Амаль кожны выступоўца скончаў сваю прамову жаданнем пакінуць вайну гісторыкам і не кіравацца негатыўным досведам у сённяшніх адносінах.

**Алесь Пілецкі**




# Расійская вайсковая прысутнасць у Беларусі: чым тое скончылася ў XVIII ст.?

### Спачатку Расія атрымала магчымасць уводзіць войскі па патрэбе. Пасля — права размяшчаць іх пастаянна. Каб нарэшце паралізаваць дзяржапарат Рэчы Паспалітай.

Дэсант 6000 расійскіх вайскоўцаў на вучэнні ў Беларусь выклікаў увагу і часам пратэсты. Ён прыцягнуў увагу да вайсковых адносінаў з Расіяй — суседкай, якая 200 гадоў акупавала Беларусь.

Расійская вайсковая прысутнасць у Беларусі пачалася даўно. Яна мае сваю гісторыю і шэраг прычын. Мы пагутарылі на гэтую тэму з гісторыкам Яўгенам Анішчанкам.



НАСТАССІЯ ШАРЭЙ

**«НН»: Спадар Яўген, з якога часу можна гаварыць аб пачатку прысутнасці расійскіх войскаў на тэрыторыі Беларусі?**

**ЯА:** Пачаткам юрыдычна афармленай расійскай прысутнасці можна лічыць 1717 год. Тады адбыўся так званы «Нямы сейм», дзе цар Пётр I атрымаў дазвол на часовы ўвод сваіх войскаў на тэрыторыю Рэчы Паспалітай у выпадку ваеннай небяспекі для Расійскай Імперыі. Унутраныя спрэчкі паміж магнацкімі родамі Рэчы Паспалітай дазволілі Расіі ўмяшацца ў справы краіны.

**«НН»: А пачынаючы з якога часу расійскія войскі пастаянна знаходзіліся на нашых землях?**

**ЯА:** Ад 1768 года. Незадоўга перад першым падзелам Рэчы Паспалітай расійская імператрыца Кацярына II змагла знайсці падтрымку ў магнацкага роду Чартарыйскіх, з дапамогай якіх былі атрыманы легальны статус для расійскіх вайсковых адзінак.

**«НН»: Чаму вайсковая прысутнасць на беларускіх землях мела такое вялікае значэнне для Масквы?**

**ЯА:** Прычына была перадусім геапалітычнай. Расія прагнула ўдзелу ў еўрапейскіх справах. Еўропа заўсёды падазрона ставілася да Расіі. Легальна трымаючы свае войскі на тэрыторыі еўрапейскай краіны, якой у той час з'яўлялася Рэч Паспалітая, Расійская Імперыя магла павялічыць свой уплыў на еўрапейскую палітыку.

**«НН»: Што адбывалася з расійскімі войскамі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай? Якую ролю яны адыгрывалі на беларускіх тэрыторыях?**

**ЯА:** Пасля падзелаў месцамі іх дыслакацыі былі павятовыя і губернскія цэнтры — Кобрын, Ліда, Ваўкавыск і іншыя. Пазней, з мэтай ізаляцыі расійскіх вайскоўцаў ад мясцовага насельніцтва, ад яго ўплыву, былі пабудаваныя вялікія гарнізоны з лазарэтамі і іншай інфраструктурай у Бабруйску, Дзвінску, іншых месцах. Войска было апорай расійскай адміністрацыі на землях Рэчы Паспалітай. Першымі чыноўнікамі былі менавіта расійскія вайскоўцы.

**«НН»: Ці існавала розніца ў паводзінах расійскіх вайскоўцаў у Беларусі і ў глыбіні Расійскай Імперыі?**

**ЯА:** Адносіны да насельніцтва акупаваных беларускіх земляў былі больш лагоднымі, чым у Расіі. Адміністрацыя ўлічвала той факт, што стаўленне да яе з боку карэннага насельніцтва было насцярожаным.

**АП**

# Янка Брыль, Вэстэрплятэ і Радзіма

Піша **Анатоль Сідарэвіч**.

Гэтыя нататкі спарадзіў тэкст Алеся Пілецкага «Першыя бомбы на Беларусь упалі ў 1939-м» («Наша Ніва» за 26 жніўня).

...У 1961—1964 гг. я жыў у вёсцы Тамашоўка Брэсцкага раёна. Гэта на сутыку Беларусі, Польшчы і Украіны. Чыгуначная станцыя ў Тамашоўцы і дасюль называецца Уладавай, бо на заходнім беразе Буга ўзвышаецца павятовы гарадок Уладава. За 7 кіламетраў на захад ад Уладавы маецца вёска Каралёўка (на польскі лад Каралюўка), адкуль родам мая дзядзіна Маруся.

У 1970-х я настаўнічаў недалёка ад Тамашоўкі — у вёсцы Радзеж Маларыцкага раёна.

Ведаючы нямецкую паводле савецкіх падручнікаў, у тым кутку Беларусі я дазнаўся, што ў немцаў часцей, чым падручнікавае das Konfekt, ужываецца калька з французскае — das Bonbon. Менавіта bonbon'амі частавалі салдаты Вермахта малых палешукоў у верасні 1939 года. Бо і Тамашоўка, і Дамачава, і Радзеж, і Маларыта на 17 верасня былі ўжо пад немцамі.

Шасцітомная «Гісторыя Беларусі» пра гэта сціпла маўчыць. Лінію фронту па стане на 17 верасня яна праводзіцьпраз польскія і ўкраінскія Радзынь, Люблін, Краснастаў, Замосце, Тамашаў, Гарадок (не блытаць з падляшскім, дзе праводзіцца «Басовішча»!), Драгобыч. Дзе той Люблін, Краснастаў, дзе той Гарадок і Драгобыч!

Такія гісторыі пішуцца. Іншыя гісторыі помняцца.

Тамашоўскія і камароўскія дзядзькі, апавядаючы пра немцаў 1939 года, не маглі зразумець, чаму немцы адступілі перад расійцамі і, не супраціўляючыся, пайшлі за Буг. А на тым беразе Буга, у Каралёўцы, бацька цёткі Марусі, стары царскі салдат, расцаніў гэтае «адступленне» як праяву сілы і моцы бальшавікоў.

...У час Вераснёвай кампаніі польскія патрыёты забілі ў ваколіцах Тамашоўкі некалькі нямецкіх салдатаў. Іх пахавалі на салдацкіх нямецкіх могілках у Тамашоўцы. (Могілкі гэтыя з мноствам магілаў, з ільвом на ўсечанай чатырохкутнай пірамідзе былі закладзеныя пасля бітвы пад Уладаваю ў жніўні 1915 года.) У 1940 годзе жыхары Тамашоўкі сталі сведкамі таго, як Вермахт клапаціўся пра сваіх салдатаў. З таго боку Буга прыйшлі машыны з лафетамі. Дамавіны з эксгумаванымі целамі жаўнераў паставілі на лафеты і ўрачыста, з адданнем воінскай пашаны, павезлі за Буг. Чэсць жывым і мёртвым нямецкім салдатам аддавалі і чырвоныя: армейцы, энкавэдзісты, памежнікі.

Тамашоўскія «палітыкі» (а сярод іх пераважалі людзі Майсеевага вызнання), якія бачылі польскіх, нямецкіх і савецкіх вайскоўцаў ды маглі супаставіць іх вонкавы выгляд, зрабілі слушную выснову:

— Як будэ нова война, німэць далэко пожэнэ большэвікоў.

Вызнаўцы Торы не здагадваліся, які лёс іх чакае. А з Тамашоўкі, з даліны Буга, добра відаць касцельную вежу ў Сабіборы. У тым самым Сабіборы, дзе быў лагер смерці. Зрэшты, тамашоўскія юдэі лягуць у чыстым полі. Іх магілу відаць з дарог Брэст—Уладава і Уладава—Кобрынь, што сходзяцца-разыходзяцца за вёскай.

...Нямецкія салдаты нічога не ведалі пра тое, калі пачнецца вайна. Едучы праз Каралёўку, дзе жыла мая дзядзіна Маруся, яны пыталіся ў сялян:

— Do Buga daleko?

І здзіўляліся, пачуўшы, што сем кіламетраў.

Стары ж мікалаеўскі салдат занепакоіўся. «Дзіткы, — казаў ён, — будэ вуйна. Трэба робыты бліндаж, бо большэвік пожэнэ німця, будэ стрыляты, бомбыты...»

Бліндаж быў зроблены ў гародзе. І калі ўранку 22 чэрвеня паляцелі нямецкія самалёты, калі там, каля Уладавы, зараўлі гарматы, калі нямецкая армада пасунулася на ўсход, сям'я цёткі Марусі схавалася ў бліндажы. Ды нядоўга там прабыла, бо хутка стала даволі ціха, хіба што машыны ішлі на ўсход ды з усходу вярталіся самалёты.

Самалёты бамбілі савецкія танкі, што размяшчаліся за станцыяй Уладава, бліжэй да Орхава, ля санаторна-лясной школы. На пачатку 1960-х у тым ляску, што прыкрываў застаўскае стрэльбішча, можна яшчэ было ўбачыць акопы — паглыбленні, у якіх стаялі «грозныя машыны»... Ніводная з іх не сышла з месца. І з дота, з якога выдатна праглядваліся даліна Буга і дарога з Уладавы на Тамашоўку, не было ніякай карысці. Гэты дот, мусіць, і зараз кожны ўбачыць на Лысай гары, калі ісці на Станіславоўку (дакладней, да былой Station Станіславоўкі).

Не было ніякай карысці і з аэрадрома ў Багуслаўцы за шаснаццаць вёрст ад мяжы, на будаўніцтва якога зганялі моладзь з Радзежа і ваколіц.

...Калі я жыў у Тамашоўцы і слухаў тамтэйшыя гісторыі (stories), пісьменнік Янка Брыль наведаў Сабібор. Мы, здаецца, былі ўжо знаёмыя. Завочна. Лістоўна.

Шкадую, не папытаўся ў Івана Антонавіча, ці бываў ён у Сабіборы да вайны. Службу стралец Ян Брыль пачынаў у Холме (Хэлме, калі на польскі лад), а дарога да Холма вяла праз Брэст і Уладаву. Гэтая дарога і цяпер пазначаная на мапе.

Перад вайною Польшча стварала сваю марскую пяхоту, і рослага («паўтара Івана») — з сямігадовай школай і гімназічным «калідорам» за плячыма — стральца Яна Брыля перакінулі на Узбярэжжа. Цяпер ён меў іншы тытул — szeregowy piechoty morskiej.

У жніўні 1939-га марскія пехацінцы пасяліліся ў асабняках, што стаялі ў ваколіцах Гдыні. У паветры пахла порахам, і гаспадары прыморскіх сядзібаў не адважваліся ехаць з Варшавы і Лодзі, каб бавіць вакацыі ды ўрлёпы ля мора, і таму мусілі ахвяраваць сваё дабро для патрэбаў войска. У манаграфіі Юрася Грыбоўскага, які падпісаўся Jerzym Grzybowskim, пра беларусаў у польскім войску ёсць, здаецца, здымак трох жаўнераў, якія сядзяць на тым пясчаным узбярэжжы. На здымку і Янка Брыль. Пісьменнік, жартуючы, каментаваў гэты здымак: «Тут курваў не хапае». Бо, не дачакаўшыся варшаўскіх ды лодзінскіх насельнікаў тых прыморскіх асабнякоў, лярвы прыставалі да жаўнераў. І да гэтых трох на здымку — таксама. І былі ў той час, як рабіўся здымак, непадалёк ад іх.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Брыль: Чым далей ад вайны, тым радзей сустракаеш у працах пра яе слова «дэзерцірства».

Калі пачалася вайна, знакаміты лінейны карабель «Шлезвіг-Гальштэйн» абстрэльваў не толькі Вэстэрплятэ (той паўвостраў, які знаходзіцца ў межах цяперашняга Гданьска), але і сопацкае, і гдынскае ўзбярэжжа таксама. Праз гады шараговец марской пяхоты Янка Брыль стане ганаровым грамадзянінам Гдыні. Аднаго разу ў размове ён скажа, што вось нехта няўважліва слухаў яго, пераблытаў Гдыню з Гданьскам і зрабіў яго абаронцам Вэстэрплятэ. Цяпер гэтая памылка качуе з выдання ў выданне і нават у Беларускую энцыклапедыю трапіла.

Успамінаючы 1 верасня 1939-га, ён скажа мне, якое ўражанне на яго зрабіў расквечаны Гданьск (тады яшчэ Danzig). Усе, хто мог бачыць, дзіваваліся, як у той ранак расчырванеўся ад сцягоў гэты нямецкі анклаў. Не ўсе жаўнеры тады ведалі, што ў нацыстаў таксама чырвоныя сцягі...

— На вайне да ўсяго звыкаеш...

І пісьменнік казаў пра тое, пра што (ці не з эстэтычных меркаванняў) ён не пісаў у мастацкіх творах і што, мажліва, прачытаем у яго запісах. Як, напрыклад, яны, згаладалыя марскія пехацінцы, ядуць з бляшанак, а побач ляжыць труп жаўнера, з якога вываліліся кішкі, і гэтыя кішкі хлэмтае падсвінак...

Адзначаў ён і нарастанне штучнага патрыятызму ў польскай літаратуры пра Абарончую вайну:

— Чым далей, тым усё менш сустракаеш у гэтых працах слова «dezercja». Хутка пра яе зусім не будзе ні слова.

Беларусам і ўкраінцам, асабліва тым, што ваявалі на захадзе і поўначы Польшчы, не было куды ўцякаць. Заставалася або смерць, або палон. Балазе, у Польскай Рэспубліцы не дзейнічала правіла «памры, але не здавайся».

Пісьменнік дзякаваў лёсу, што яму пашэнціла з палонам. І за тое дзякаваў, што не ўдалося ўцячы першы раз — у 1940-м. Хто ведае, ці не апынуўся б былы польскі марскі пехацінец Янка Брыль у адной калоне з былым польскім жаўнерам Барысам Рагулем, які ўцёк з нямецкага палону і якога ў чэрвеньскія дні 1941-га ў доўгай — на некалькі кіламетраў — калоне вялі з мінскае турмы па Магілёўскай шашы. Нагадаю, што ў той калоне былі Зэлік Аксельрод, Рыгор Бярозкін, Масей Сяднёў, Мікола Цэлеш...

Янку Брылю ўдалося ўцячы пад канец 1941-га. Ужо выпаў снег, і загорскія мужчыны і дзецюкі на санях ехалі ў бок Налібоцкае пушчы. На першых санях сядзеў Мікалай Брыль. «Коля!» — гукнуў Янка Брыль...

Так ён вярнуўся на Радзіму. А праз колькі дзён ён пайшоў праведаць сваю сястру Ганну, што жыла ў Палужжы пад Карэлічамі. Ганніна хата стаяла на пагорку, і, калі ён падышоў да яе, пачуў мужчынскі голас:

— Ваня идёт!

Што да хаты падыходзіць менавіта Ваня, а не хто іншы, па фотаздымках, якія захоўваліся ў Ганны, вызначыў савецкі акружэнец Міхаіл Іпатаў. Лёс распарадзіўся так, што ён, напалавіну русак, напалавіну кіргіз, стаў бацькам беларускай пісьменніцы Вольгі Іпатавай. А гэта яшчэ адна ненапісаная story.

**У польскай Гдыні з'явілася вуліца Янкі Брыля**

Імя беларускага пісьменніка нададзена вуліцы ў адным з новых мікраёнаў гораду.

# Шоу працягваецца

У Палацы мастацтваў (вул.Казлова,3) працягваецца вялікі арт-фестываль «Дах-9»: няўтомныя Родзін і Кужо памянялі экспазіцыю ў галоўных залах, а на трох узроўнях Палаца адбываюцца культурныя імпрэзы: перформансы, сеансы аўдыё- і відэаарту, літаратурныя вечарыны і міні-канцэрты.

«Кожны дзень на фестываль прыходзіць шмат народу, — кажа адна з работніц Палаца. — То на першы паверх раптам ідзе суцэльная чорная сцяна падлеткаў — там будзе міні рок-канцэрт, то на другім паралельна ходзяць людзі з вымазанымі фарбай тварамі — у іх толькі што адбыўся перформанс. Мы нават такога не чакалі: зазвычай у нас суцэльная цішыня».

10 верасня ў Палацы мастацтваў адбыўся выступ унікальнай тэатральнай суполкі «Альтэр Эга». Асноўны склад суполкі 7 чалавек — усе яны сталыя насельнікі мінскага псіханеўралагічнага інтэрната № 3. Акторы прадстаўлялі жанрава розныя нумары: тэатральныя і пантамімічныя мініяцюры, вакальныя і харэаграфічныя нумары. Людзі з псіхафізічнымі асаблівасцямі і інтэлектуальнымі абмежаваннямі могуць быць фантастычнымі акторамі, што і давёў выступ суполкі. «Большасць свайго жыцця нашыя артысты бавяць у сценах інтэрната, — кажа Святлана Яцэвіч-Падлівамчава, кіраўнічка групы. — І таму, калі нас запрашаюць на канцэрт, дык для трупы — гэта як глыток свежага паветра. Вельмі шкада, што ў Мінску нас баяцца запрашаць: мы не толькі жывімся станоўчай энергетыкай ад гледачоў, але і самі з радасцю дзелімся сваімі, паверце, часам значнымі, талентамі».

Арт-фэст працягнецца да 20 верасня.

**ЛК**

### 16 верасня

Выдавецтва «Галіяфы» прэзентуе кнігі Барыса Пятровіча «Пiлiпiкi», Эдуарда Акуліна «Вітражы», Леаніда Дранько-Майсюка «Анёлак і я». У імпрэзе бяруць удзел: Віктар Шалкевіч, Уладзімір Арлоў, Уладзімір Някляеў, Міхась Скобла, Анатоль Івашчанка, Анатоль Вярцінскі, Генадзь Бураўкін, Андрэй Хадановіч, Алесь Камоцкі. **Пачатак а 18-й.**

### 17 верасня

Канцэрт бардаўскай музыкі. **Пачатак а 17-й.** У той жа дзень, але а 19-й пачнецца серыя перформансаў і музычных эксперыментаў ад: ДСП ды X «МЕХАНЁРЫ КУЛЬТУРЫ», «Inspiration», Karaoke Vomit, Spit It Out, Racionalnaja Dieta.

### 18 верасня

Канцэрт «The Trip» у стылях electro, ambient, experimental ад ды-джэяў і музыкаў: **Elena Lectra**, **Unc-Ou**, **Tforzki vj's: Gagaga**, **Dxyz**. **Пачатак а 18-й.**

### 19 верасня

Літаратурны слэм (бітва паэтаў). Вядоўца Маргарыта Аляшкевіч. **Пачатак а 17-й.** Кінапрэм'ера стужкі Віктара Жыбуля і Джэці «Страказа», выступ гурту **«Сонечны Сахалін»**. **Пачатак у 19.30.**

### 20 верасня

«Dark way party III: адкрыты фармат». Гэта музычная вечарына, прысвечаная культуры Сярэднявечча, з удзелам музычных праектаў: **Volk**, **Dromos**, **Favourite mirror**, **Радагост**. Таксама ў праграме — спецыяльныя нумары ад Anadea і гурту гістарычнага танца «Фламея». **Пачатак у 19.00.** Уваход па запрашэннях. Колькасць месцаў абмежаваная. Замова запрашэнняў па т.: (029) 678-75-36, 778-75-31.




**The Prodigy**

**5 кастрычніка на стадыёне «Дынама»** — канцэрт **The Prodigy** (Вялікабрытанія), **Drum Ectasy** (Беларусь), **Юрыя Дземідовіча** (Беларусь), **Dub FX** (Аўстралія-Вялікабытанія), **The Amatol** (Расія). Падрабязная праграма — на афіцыйным сайце UltraMusicFestival.

## ІМПРЭЗЫ



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Сустрэча з Рыгорам Барадуліным

**17 верасня а 17-й у Музеі гісторыі беларускай літаратуры (вул.-Багдановіча, 15)** пачнецца творчая сустрэча з Рыгорам Барадуліным «Пасլаць Маме душу...»,на якой адбудзецца прэзентацыя кнігі ліставанняў Рыгора Барадуліна з мамай «Паслаў бы табе душу…». Сярод гасцей вечарыны пісьменнікі, даследчыкі, сябры — Сяргей Панізнік, Уладзімір Някляеў, Міхась Скобла, Алесь Камоцкі, Наталля Давыдзенка, Марына Шыбко.

### Прэзентацыя новай кнігі Уладзіміра Арлова

Прэзентацыя кнігі паэзіі Уладзіміра Арлова «Усё па-ранейшаму. Толькі імёны змяніліся» адбудзецца **ў сядзібе ТБМ (вул.Румянцава, 13) 21 верасня**. **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

### Манхэтэнскі фестываль кароткаметражнага кіно

**У Беларусі ад 17 да 27 верасня** пройдзе Манхэтэнскі фестываль кароткаметражнага кіно. Паказы адбудуцца ў сталічным Аўтакінатэатры «ЗАТ «Гандлёвы свет — «Кальцо». У конкурсную праграму гэтага года ўвайшлі 10 фільмаў рэжысёраў з розных краін свету.

### Інтэрактыўная рэканструкцыя падзей верасня 1939 года ў Гродне

**17 верасня ў Гродне (вул.Будзённага, 48а, зала ў дворыку будынка)** адбудзецца інтэрактыўная рэканструкцыя падзей верасня 1939 года ў Гродне. У праграме таксама прэзентацыя фота з гісторыі міжваеннага Гродна, музычна-вершаванае прадстаўленне «Сага пра Гародню» па матывах гродзенскай лірыкі першай паловы XX ст. **Пачатак у 18.30.**

### Раманзнябёс

**18 верасня ў канферэнц-зале Палаца мастацтваў** — прэзентацыя кнігі Зоі Гарынай «Раманзнябёс». **Пачатак а 18-й.** Бяруць удзел Ірына Саламаціна (аўтар прадмовы), Наталля Кучмель (рэдактар), Міхась Башура, Уладзімір Кузьмін. Алена Кантэр (Расія), зорка піцерскага шансона, выканае песні і рамансы Зоі Гарынай.

### Гадавіна ТБМ

Урачыстае пасяджэнне, прысвечанае 20-годдзю ТБМ, пройдзе **27 верасня (нядзеля) на Управе БНФ (вул.Машэрава, 8)**. **Пачатак у 13.00,** уваход вольны.

## КАНЦЭРТЫ

### Pre-party канцэрта The Prodigy адбудуцца па ўсёй Беларусі

Акунуцца ў атмасферу будучага канцэрта The Prodigy хутка змогуць жыхары **Гомеля (19 верасня, клуб «Нэма»)**, **Віцебска (25 верасня, клуб «Зебра»)**, **Магілёва (26 верасня, клуб «Метро»)**, **Пінска (2 кастрычніка, клуб «Піна»)** і **Брэста (3 кастрычніка, клуб «Баварыя»)**. У рамках pre-party гледачы змогуць пачуць найлепшыя запісы The Prodigy і блізкіх ім па духу калектываў, тэматычныя фрык-шоу і конкурсы.

### Блюз ад Юрыя Несцярэнкі

**17 верасня ў Тэатры рускага раманса (вул.Чыгуначная, д.27, корп.2)** — аўтарская праграма Юрыя Несцярэнкі (лідэра гуртоў «White Night Blues», «Nestary Band»). **Пачатак а 19-й.**

### Крама

**18 верасня ў «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — канцэрт «Крамы». **Пачатак а 19-й.**

### «Рокаш» і Rosy

**19 верасня ў «Графіці»** — канцэрт «Рокаш» і Rosy. **Пачатак а 19-й.**

### Neuro Dubel

**20 верасня а 19-й у «Графіці»** — канцэрт Neuro Dubel.

## ВЫСТАВЫ

### Новыя вобразы

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) да 27 верасня** працуе выстава «Новыя вобразы: выстава сучаснага кітайскага жывапісу тушшу». На выставе дэманструюцца працы 22 аўтараў. Пейзажы, жанравыя кампазіцыі, якія выражаюць не толькі стан душы, але і дазваляюць прасачыць як агульнае, характэрнае для кітайскага выяўленчага мастацтва, так і асаблівасці творчага самавыяўлення, арыгінальнасць індывідуальнага стылістычнага почырку.

### З глыбіняў у будучыню

**У Музеі беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах да 29 лістапада** працуе выстава «З глыбіняў у будучыню» (Т.Васюк, Л.Малахава і іх школа).

### Заходняя Беларусь у мастацтве

**17 верасня ў Мастацкім музеі** адчыняецца выстава «Заходняя Беларусь у мастацтве», прымеркаваная да 70-годдзя аб'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі. Прадстаўленыя творы са збораў Мастацкага і Гістарычнага музеяў, Літаратурнага музея імя Янкі Купалы, Смаргонскага гісторыка-краязнаўчага музея і іншых. Выстава працуе **да 19 кастрычніка**.

### Мастакі Беларусі XIX — першай паловы XX стст.

**У Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20)** адкрылася сталая экспазіцыя «Мастакі Беларусі XIX — першай паловы XX стст.». Прадстаўленыя творы Аляшкевіча, Хруцкіх, Бяльніцкага-Бірулі, Рушчыца і многіх іншых.

### Жывапіс агнём

**У Музейным комплексе гісторыі і культуры Аршаншчыны (стары млын, вул.Замкавая, 3, Орша) да 20 верасня** працуе выстава «Жывапіс агнём». Ахвотныя змогуць убачыць ажурныя сурвэткі, дарожкі, абрусы, паланціны, шалікі, дэкаратыўныя хусткі. Усе працы выкананы з дапамогай распаленай іголкі.

## ТЭАТРЫ

### Тарас на Парнасе

**Тэатр юнага гледача** адкрывае новы сезон спектаклем Сяргея Кавалёва «Тарас на Парнасе», што адбудзецца **17 верасня 2009 года а 19-й на сцэне клуба ім. Дзяржынскага (вул.Камсамольская, 30)**. Гэтая імпрэза, якая стала сапраўднай візітоўкай тэатра, адзначыць свой юбілейны 70-ты паказ.

### Тэатральны куфар

**З 28 верасня да 3 кастрычніка** адбудзецца VI Міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар-2009». Да ўдзелу ў фестывалі «Тэатральны куфар-2009» запрошаныя тэатральныя калектывы з Беларусі, Расіі, Англіі, Бельгіі, Латвіі, Мексікі, Сербіі, Германіі, Грэцыі, Ірана, Польшчы, Алжыра, Турцыі, Эстоніі, Літвы, Славеніі. Усяго 22 спектаклі, каля 300 удзельнікаў!

## «Стары Ольса» ў Гальшанскім замку



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**3 кастрычніка** гурт «Стары Ольса» святкуе 10-годдзе. З гэтай нагоды ў Гальшанскім замку — вялікае свята. У праграме: рыцарскія забавы і атракцыёны, катанне на конях, восеньскі кірмаш, канцэрт «Ольсы» разам з гуртамі «Тэстаментум Тэрра», «Расалія», «Келіх кола», а таксама фаер-шоу і салют. Продаж квіткоў і арганізаваны выезд з Мінска — Алесь Кушнер. Т.: (029) 677-00-46.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Геймер»




**Геймер** (Gamer)
ЗША, 2009, каляровы, 95 хв.
**Рэжысёры:** Марк Нэвэлдайн, Браян Тэйлар
**Ролі выконваюць:** Джэрард Батлер, Майкл С.Хол, Кайра Сэджвік, Логэн Лерман
**Жанр:** Сацыяльная фантастыка, кампутарны баявік
**Адзнака:** 6 (з 10)

Стужка Марка Нэвэлдайна і Браяна Тэйлара — бадзёрая сацыяльная фантастыка, зробленая ў традыцыях кампутарнае гульні. Людзі пад прыцэлам, стрэлы і выбухі, разарвана-віртуальныя целы, тэлевізія, што транслюе амаральныя відовішчы. Кожны кадр стужкі апрацаваны, як у коміксе «300», кожная кропля крыві — ілюзія пад дакументальнае відовішча.

Кампутарны геній Кен Кастл стварыў тэхналогіі, што дазваляюць кантраляваць іншых людзей — і гуляць імі, як у віртуальнай гульні. Джон Цілман, асуджаны на пажыццёвае зняволенне, вядомы як зорка стралялкі «Забойцы». Кіраваны семнаццацігадовым геймерам, ён не прайграў ніводнага бою і набліжаецца да прызавой, апошняй гульні. Цілман марыць вырвацца з турмы і знайсці жонку з дачкою. Але Кастл плануе публічна забіць яго.

«Адрэналінавай» мовай падлеткам распавядаюць пра капіталізм і падполле, пра гераічных хакераў і гламурных падонкаў-мільянераў. Татальны кантроль над грамадствам, само грамадства як малімонна-разбэшчаная гульня, адмова ад свабоды — і бойкі за волю.

У гэтых умовах акторы проста не паспяваюць сыграць, Джэрард Батлер паўтарае гераічныя спартанскія жэсты, а Майкл Хол крывіцца ў зладзейскіх грымасах. Але большага ад іх і не патрабуецца.

Чырвона-блакітныя сцэны юру, шэры попел смерці, уцёкі за межы. Але куды ўцячэш з татальнай кампутарнае гульні?

**Андрэй Расінскі**

# У ЕГУ адкрыта праграма МВА

**Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт будзе выпускаць магістраў бізнэс-адміністравання.**

У 2009/2110 навучальным годзе ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце адкрыта новая магістэрская праграма — МВА — магістр бізнэс-адміністравання. Праграма распрацавана Цэнтрам бізнэс-адукацыі ЕГУ ў супрацоўніцтве з бізнэс-школай Кемі ўніверсітэта Лімерыка, Ірландыя, пры падтрымцы ўрада Ірландыі. Карэспандэнт «Нашай Нівы» пагутарыла з дырэктарам Цэнтра бізнэс-адукацыі Паўлам Малюковічам пра асаблівасці і магчымасці МВА ў ЕГУ.

**НН: Раскажыце пра праграму. На каго яна разлічана? Колькі будзе цягнуцца навучанне?**

**ПМ:** Праграма МВА ў ЕГУ зарэгістравана ў Міністэрстве адукацыі Літвы. Людзі, якія скончаць гэтую праграму, атрымаюць ступень магістра бізнэс-адміністравання і дыплом еўрапейскага ўзроўню. Мы мяркуем, праграма будзе цікава для беларусаў, якія вядуць бізнэс, у першую чаргу з еўрапейскімі краінамі. Праграма разлічана на тры семестры, 1,5 года. Першыя 2 семестры па 5 вучэбных прадметаў, апошні семестр — два прадметы і магістэрская дысертацыя. Мы будзем прапаноўваць пісаць дысертацыі, прысвечаныя практычным праблемам, з якімі ў сваёй бізнэс-працы сутыкаюцца студэнты.

**«НН»: Чым праграма МВА ў ЕГУ адрозніваецца ад беларускай эканамічнай адукацыі?**

**ПМ:** Мы адышлі ад ідэі даваць студэнтам гатовыя рэцэпты і шаблоны. Сёння бізнэс атрымаў выклік у выглядзе эканамічнага крызісу. Рэцэпты, якія былі цікавымі і працавалі 10-20 гадоў таму, сёння не працуюць. Тое, што спрацавала ў Нямеччыне, можа не ўдацца ў Беларусі. Базавы метад, які сёння выкарыстоўваецца ў большасці бізнэс-школ — вывучэнне пэўных кейсаў. Кейс-метад — гэта цікава і карысна, але далёка не ўсё, што можна атрымаць ва ўніверсітэце. У нашай праграме мы не хочам трэнінгаў, мы хочам адукацыі. Для нас важна, каб студэнты самі прыйшлі да высноў з праблем, якія яны бачылі ва ўласным бізнэсе.

**НН: Колькі студэнтаў плануеце набраць на праграму ў гэтым годзе?**

**ПМ:** Плануем 24 студэнты.

**НН: Хто будзе выкладаць?**

**ПМ:** Нашы выкладчыкі — гэта людзі, якія маюць бізнэс-вопыт ў Беларусі. Яны мелі бізнэс раней, маюць яго сёння, займаюцца кансультацыйнымі праектамі ці працуюць у радзе дырэктараў у беларускіх кампаніях. У любым выпадку, усе маюць вопыт у вядзенні бізнэсу ў Беларусі. За апошні год выкладчыкі атрымалі даволі значны «цюнінг». Усе калегі — гэта 12 чалавек, бо 12 дысцыплінаў, — былі ў бізнэс-школе Кемі ў красавіку гэтага года. Мы вывучалі іх досвед у арганізацыі бізнэс-адукацыі. Акрамя таго, выкладчыкі праграмы атрымалі ступень міні-МВА ўніверсітэта Лімерыка. Гэта вельмі цікавы вопыт: мы набылі веды па тых дысцыплінах, якія самі нават не выкладаем.

**НН: А навошта гэтая міждысцыплінарнасць?**

**ПМ:** Гэта наша адрозненне. Міждысцыплінарнасць забяспечваецца ратацыяй выкладчыкаў.

**НН: Якім чынам будзе праходзіць навучанне для студэнтаў? Дзённае навучанне ці завочнае?**

**ПМ:** Ёсць мінімальныя патрабаванні літоўскага Міністэрства адукацыі па колькасці аўдыторных гадзінаў. Па плане адукацыя будзе праходзіць пяцідзённымі сесіямі адзін раз на месяц. Мы адмовіліся ад заняткаў у суботу і нядзелю, а таксама вечарамі. Уся гэтая вечаровая бізнэс-адукацыя — гэта несур'ёзна. Калі чалавек ведае, што яму патрэбна атрымоўваць дадатковыя веды, ён робіць выбар прысутнічаць 5 дзён у месяц на занятках. Мы заўсёды інвестуем у свае веды. Гэта недарэмна патрачаныя грошы і час. Усё акупіцца пазней у выглядзе новага статусу і дадатковых магчымасцяў, каб удасканальваць свой бізнэс.

**НН: Паміж паездкамі на сесіі студэнты будуць кантактаваць з выкладчыкамі?**

**ПМ:** Так. Выкладчык будзе даваць заданні. Сёняшні свет — гэта адкрыты электронны доступ. Паміж выкладчыкамі і студэнтамі заўсёды будзе зваротная сувязь цягам трох тыдняў, якія яны не бачацца паміж модулямі.

**НН: Падчас існавання Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта ў Літве яшчэ не было ніводнай эканамічнай праграмы. Чаму вы вырашылі адкрыць МВА менавіта ў ЕГУ?**

**ПМ:** Эканоміка — гэта не матэматычная навука. Эканоміка — навука пра грамадства і чалавека ў грамадстве. Калі ЕГУ — гуманітарны ўніверсітэт, то, на нашу думку, ён павінен даваць адукацыю па ўсяму спектру таго, што калісьці Дэвід Юм называў «moral science», «маральныя навукі». Калі ва ўніверсітэце ёсць філасофскія, сацыялагічныя праграмы, то ўніверсітэт павінен мець і эканамічную адукацыю. Гэта быў абсалютна лагічны крок, каб дасягнуць гэтай мэты.

**Запісала Настасся Шамрэй**

КОНКУРС

## «Сямейны Альбом 1989-2009»

Знайдзіце ў сямейных архівах здымкі-сведчанні эпохі пераломy і абуджэння, што пачалася падзеннем Берлінскага мура. Даведайцеся іх гісторыю і зрабіце яе творчую пераапрацоўку — у эсэ ці інтэрв'ю, калажы ці малюнку, новым здымку ці фільме... Мовы конкурсу: нямецкая, беларуская, расійская.

Дасылайце свае працы з запоўненай анкетай: Інстытут імя Гётэ ў Мінску (на канверце пазначыць: Конкурс «Сямейны альбом»), вул. Фрунзе, 5, 220034 Мінск. Ці мэйлам: volontaer@minsk.goethe.org. Апошні тэрмін адпраўкі матэрыялаў — 30 верасня.

## Беларускі Калегіум прапануе

дадатковае навучанне па спецыялізацыях: журналістыка, найноўшая гісторыя, філасофія/літаратура, спецкурс па фатаграфіі.

Запрашаюцца студэнты старэйшых курсаў, асобы з вышэйшай адукацыяй.

Навучанне ў БК — бясплатнае. Пачатак заняткаў з 5 кастрычніка 2009 г. Запіс на сумоўе да 25 верасня.

Дадатковая інфармацыя: bk.baj.by, т.: (29) 276-27-15, (29) 679-26-82




ТЭЛЕПРАГРАМА НА 21—27 ВЕРАСНЯ

# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 21 верасня, панядзелак

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 19 серыя
**19:50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:20** Госць «Белсата»
**20:40** Беларусы ў Польшчы
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:25** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Альгерд» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** «Пачатковая школа», камедыя, рэж. Ян Сверак, 1991 г., Чэхаславакія.
**23:05** Аб'ектыў

### 22 верасня, аўторак

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** МакраФон: З архіву «Jazz Jamboree»: «Archie Shepp Group», ч. 2
**19:40** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**20:10** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**20:40** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Рагвалод і Рагнеда» (спазнаваўчая праграма)
**21:25** Без рэтушы: «Стваральнікі пераможцаў», дак. фільм, 2009 г., Польшча
**21:50** Маю права (прававая праграма)
**22:05** Аўтастопам праз Еўропу, 2 серыя: Нямеччына
**22:20** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**22:40** Аб'ектыў

### 23 верасня, серада

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**19:40** Невядомая Беларусь: «Днюка», дак. фільм, рэж. Андрэй Куціла, 2009 г., Беларусь
**20:25** Рэпартэр (публіцыстычная праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Дзяржавы» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 25 серыя
**22:25** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма)
**22:40** Аб'ектыў

### 24 верасня, чацвер

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 19 серыя
**19:35** YoLife! (моладзевая праграма)
**19:55** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:20** Без рэтушы: «Афганец», дак. фільм, 2009 г.
**20:40** Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў, 14 серыя: «Ці патрэбная еўрапейская канстытуцыя?»
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Усяслаў Чарадзей» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «7 разоў Масква», дак. фільм, рэж. Пётр Стасік, 2009 г., Польшча
**21:55** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**22:10** Жаўтуха (сатырычная праграма)
**22:40** Аб'ектыў

### 25 верасня, пятніца

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Дэтэрмінатар», серыял: 12 серыя
**19:50** «Minsk-Mixt-2008»: ч. 4: Канцэрт гурту «Svet Boogie Band»
**20:05** Невядомая Беларусь: «Варганы», дак. фільм, рэж. Алег Дашкевіч, 2008 г., Беларусь
*Беларуская правінцыя — гэта прырода, міфы і шчырыя, адкрытыя людзі. Шаша знікае. На адной з шыльдаў раптам усплывае надпіс: Варганы. Гэтая вёска месціцца побач з высокаю, парослаю лесам гарою, вяршыню якой можна пабачыць за некалькі дзесяткаў кіламетраў. З пракаветных часоў гару ахутвалі гістарычныя легенды і містычныя паданні. Пры ўездзе ў вёску зрок спыняецца на трох высокіх каменных крыжах. Казачнае спалучэнне гары і каменных крыжоў наводзіць на думку: тут могуць жыць асілкі. Яны і сапраўды тут жывуць. Аляксандру Каўбасічу 83 гады. За сваё доўгае жыццё ён пакутаваў на прымусовай працы пад немцамі, у сталінскім ГУЛАГу. Ён мае што расказаць.*
**20:35** Госць «Белсата»
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Багі» (спазнаваўчая праграма)
**21:25** «Вулічныя гульні», маст. фільм, рэж. Кшыштаф Краўзэ, 1996 г., Польшча.
**23:05** Аб'ектыў

### 26 верасня, субота

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** Аўтастопам праз Еўропу, 3 серыя: Галандыя
**19:25** «Старыя Кросны», рэпартаж, рэж. Юрый Выдронак, 2007 г.
**19:35** Кухня (музычна-публіцыстычная праграма)
**20:00** Еўропа сёння (тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:25** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:15** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Беларусы ў гусіцкіх войнах» (спазнаваўчая праграма)
*Пасля перамогі ў Грунвальдскай бітве, калі злучанае войска Ягайлы і Вітаўта разбіла тэўтонскіх рыцараў, пачаўся самы спрыяльны перыяд у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Межы яго сягалі ад Чорнага да Балтыйскага мора. На працягу пэўнага часу пад пратэктаратам літвінаў апынуліся таксама і чэхі...*
**21:25** Суботні сеанс: «Кароль падробак», камедыя, рэж. Гарк Сюй, 1998 г., ЗША. У ролях: Жан-Клод ван Дам, Роб Шнайдэр.
*Дзеянне фільма адбываецца ў Ганконгу ў момант яго далучэння да камуністычнага Кітая.*




**22:50** Аб'ектыў

### 27 верасня, нядзеля

**19:00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**19:20** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 20 серыя
**20:05** «Бульбаны», мультсерыял
**20:10** Форум (ток-шоу): «Смяротнае пакаранне: «за» і «супраць»»
*Вока за вока, зуб за зуб — дзікасць? Мы цывілізаваныя людзі, у нас гуманнае грамадства, мы не можам так жыць, бо гэта супярэчыць сучаснай этыцы і законам! Але што рабіць з тымі, хто замахнуўся на безабаронную асобу? Падараваць яму жыццё ці забраць? Гэтае пытанне мае не толькі прававы, але і маральна-этычны аспект. Праблема датычыць кожнага з нас, бо сёння ў нашай краіне ўсё яшчэ існуе смяротнае пакаранне.*
**21:00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21:25** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21:50** Фільматэка майстроў: «Зламаныя кветкі», маст. фільм, рэж. Джым Джармуш, 2005 г., ЗША.




**Уверсе — 18-гадовая беларуская Міс Мінск, а ўнізе — Місіс Лас-Вегас. У гэтым амерыканскім горадзе прайшоў конкурс прыгажосці для тых, каму за 50.**



# Дынастычны шлюб

**ЛЕВЫМ ВОКАМ**



Сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Далі Грыбаўскайтэ ў Вільні мусіць выклікаць у сталіцах суседніх дзяржаваў пярэпалах. Фельетон **Лёліка Ушкіна**.

— Ярослаў, шо такэ? Чаго Вы нас пазвалі? — спытаў Віктар.

Тое ж нямое пытанне чыталася і ў вачах Дзмітрыя, які, адкінуўшы геапалітычную лінію, упершыню ў жыцці быў згодны з украінскім калегам. Нечаканы званок з Варшавы з просьбай як найхутчэй прыехаць на трохбаковую сустрэчу выглядаў дзіўна.

— Спакойне, каледзы, спакойне, — утаймоўваў эмоцыі гаспадар. — Вы ведаеце, што наш сусед едзе ў Вільню? Ведаеце, што ён будзе там сустракацца з Даляй?

— І шо? Я з ёй таксама сустракаўся некалі.

— Як гэта шо?! — сарваўся Ярослаў. — Паглядзі на сябе — прыкладны сем'янін, жонка і дзяцей пяцёра! А ён — вольны казак! Спартсмен! Хакеіст!

— Хм, і Даля таксама спортам захапляецца... — прыгадаў Дзмітрый. — Каратэ... Амаль як наш Уладзімір Уладзіміравіч... Няўжо вы думаеце, што Аляксандр з Даляй...

— Сто працэнтаў! Уяўляеце, што будзе, калі гэтых дваіх пакінуць на перамовы за зачыненымі дзвярыма?! Дынастычны шлюб! Фактычнае аднаўленне Вялікага Княства Літоўскага! — Ярослаў цяжка бразнуў аб стол гістарычным атласам. — Глядзі, Віця: пачатак пятнаццатага стагоддзя. Ля Крыма паўднёвая мяжа! А ты, Дзмітрый, нядаўна «Расія, наперад» пісаў? Ды твой перад будзе за Старадубам, калі ім не перашкодзіць!

— Ой-ё-ёй... Пры яго адносінах з Бенедыктам, праз паўгода наш сусед з вялікага князя зробіцца каралём, — асэнсаваў сур'ёзнасць сітуацыі Дзмітрый. — Можа, Вы, Ярослаў, карону... як мінулы раз?..

— Куды там! Свой жа Туск закладзе прэсе!

— І шо рабіты?

— Можа, палоній? — Дзмітрый быў выхаваны ў рэчышчы палітычнай культуры, схільнай да простых і эфектыўных метадаў.

Ярослаў адмоўна паківаў галавою.

— Трэба проста не дапусціць, каб амур выпусціў сваю стралу. Будзе дастаткова, калі мы задурым Далі галаву нейкай іншай кандыдатурай. Уся ў марах пра прынца, яна нават увагі не зверне на волата постсавецкай інтэграцыі... Давай, Дзмітрый, ты самы малады. Звані. Пляці ўсякую любоўную лабуду. Вось нумар...

— Пачакайце. Мне трэба параіцца (Дзмітрый тэлефануе). Алё? Уладзімір Уладзіміравіч? А, вы чулі... Не, на палоній не пагаджаюцца. Дык можна? А жонка? А, не лічыцца... Ну, усё — да сувязі.

Дзмітрый узяў паперку з нумарам і пачаў зноў ціскаць кнопкі на мабіле. Завісла трывожнае маўчанне.

— Алё? Ну, прывітаннейка, прыгажуня... Ой! Прабачце... а з кім я размаўляю? З кім? З Сашам?!

— Матка боска, — збялеў Ярослаў.

— Прабачце, а... што Вы там робіце? — асцярожна запытаў Дзмітрый. — Што? Жывяце са сваёй жонкай?!..

— Спазніліся, — Віктар закрыў твар рукамі. Яму ўявіўся ўваход войскаў Альгерда Гедымінавіча ў Кіеў.

— Дамаўляйся, — зашаптаў Ярослаў. — Абяцай усё, што заўгодна.

Дзмітрый выдыхнуў:

— Слухайце, Шура, давайце без эмоцый. Мы разумеем, што ў ВКЛ ёсць абгрунтаваныя тэрытарыяльныя прэтэнзіі. Аднак мы мусім шукаць кампраміс у рамках Хельсінскіх дамоў, о'кей? Калі вы не будзеце патрабаваць Смаленск і Мажайск, мы гатовыя вызнаць вашы інтарэсы ў Курляндыі і аддаць два раёны Бранскай вобласці.

—А мы — Чарнобыль! — дадаў Віктар.

— Што? — Дзмітрый апусціў мабілу.

— Ну?!

— Сказаў, што нумарам памыліліся...

Змоўшчыкі ўздыхнулі з палёгкай.

Дзмітрый зноў пачаў ціскаць кнопкі на тэлефоне. Але гэтым разам абанент быў недаступны.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Ст. Палачаны.** Віленскай губ., Ашмянскага пав. 20 жніўня тут пралацеў з людзьмі карабель па паветры.

**«Наша Ніва». №35. 1909**

## Дарагія чытачы!

Наступны нумар «Нашай Нівы» выйдзе 30 верасня. Усе — на дакопкі!

## АНЕКДОТЫ

Як адрадзіць Вялікае Княства Літоўскае?

Трэба, каб Лукашэнка ажаніўся з Грыбаўскайтэ і ўсынавіў Ючшанку.

* * *

Шчасце — гэта калі дзеці накормленыя, абутыя, апранутыя, здаровыя і іх няма дома.

* * *

Пачатак заняткаў у аўташколе: кіроўца — істота вышэйшая за пешахода, паколькі пешаход паходзіць ад малпы, а кіроўца — ад пешахода.


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КАЦЯНЯТЫ

**Аддамо траіх** вельмі прыгожых кацянят у добрыя ласкавыя рукі. Т.: (029) 626–41–56 (Сяржук) альбо (029) 553–04–19 (Таццяна). Здымкі на email.

### ТАЛЬКАЎСКІ ФЭСТ

**Талькаўскі фэст сёлета адбудзецца 4 кастрычніка.** Пачатак а 12 гадзіне каля клуба, працяг ля вогнішча на беразе Талі. Сардэчна запрашаем! Падрабязнасці на сайце talka.info ці па т.: (029) 377–99–59

### СЯБРОЎСКАЕ ПАДАРОЖЖА

**Запрашаем у падарожжа 4 кастрычніка** (нядзеля) па маршруце: Мінск — Залессе — Смаргонь — Кушляны — Жупраны — Ашмяны — Гальшаны — Баруны — Крэва — Мінск. Т.: (017) 292–54–58, (029) 622–57–20, (029) 509–12–16, (029) 110–19–28

### КНІГІ

**Куплю 7 і 8 тамы** Беларускай Энцыклапедыі. Т.: (029) 461–73–11



**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**


©НАША НІВА. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6150. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 15.09.2009.
Замова № 5055.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
ISSN 1819-1614
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12